Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 СТУДЗЕНЯ 2008 г. СУБОТА
№ 16 (26129)
Кошт 430 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Паказчыкі работы лёгкай прамысловасці ў 2008 годзе павінны быць вышэйшыя, чым іншых галін

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання ў Жодзіне выстаўкі тавараў, якія выпускаюцца арганізацыямі канцэрна «Беллегпрам».

«Пакуль што вы не можаце прапанаваць людзям нармальны тавар, каб яны не куплялі нізкаякасны імпарт, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да прадстаўнікоў прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. — Мы гаворым пра тэкстыль столькі, колькі я Прэзідэнт. Галіна знаходзіцца ў глыбокай яме».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на неабходнасць найхутчэйшага тэхналагічнага пераабсталявання галіны, нарошчвання экспартных паставак тавараў лёгкай прамысловасці Беларусі, у тым ліку ў краіны ЕС, а таксама павышэння прадукцыйнасці працы. Акрамя таго, Прэзідэнт асабліва адзначыў нізкі ўзровень менеджменту ў гэтай галіне.

«Я цвёрда перакананы: дырэктары — лайдакі. Калі не можаце справіцца — ідзіце, — заявіў Прэзідэнт. — Я ўзяў на кантроль некалькі прадпрыемстваў. Там, дзе мы падналіснулі, справы ідуць так, як трэба».

У якасці станоўчага прыкладу кіравання прадпрыемствам кіраўнік дзяржавы назваў кіраўніцтва СТАА «Марка».

Лёгкая прамысловасць Беларусі павінна выпускаць тое, што сёння запатрабавана на рынку, і тое, што будзе запатрабавана заўтра. Звяртаючыся да кіраўнікоў прадпрыемстваў легпрама, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Я хачу, каб вы далі права выбару нашаму народу, апранулі людзей так, як апранаюць ва ўсім свеце. Я хачу, каб дарослыя і дзеці насілі добры абутак, каб не куплялі яго за мяжой».

Прэзідэнт наведаў у Жодзіне выстаўку тавараў, якія выпускаюцца арганізацыямі канцэрна «Беллегпрам». Паводле яго слоў, тут прадстаўлены нядрэнныя рэчы, якія ёсць у масавай вытворчасці і продажы. «Калі б такога ўзроўню была ўся прадукцыя, тады можна было б патрабаваць не захавання галіны, а яе дынамічнага развіцця», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Аднак сёння, на яго думку, добра працуюць толькі 50 працэнтаў прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці.

Асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка ўдзяліў неабходнасці забяспечыць дастойныя ўмовы працы і заработную плату на прадпрыемствах легпрама. Сёння 80 працэнтаў працуючых тут складаюць жанчыны. Акрамя таго, на нарадзе разгледжаны пытанні абнаўлення асноўных вытворчых фондаў. «Існуе вялікая зношанасць фондаў, іх трэба мяняць, мадэрнізаваць. Але пакуль трэба выпускаць прадукцыю на такім абсталяванні. А для мадэрнізацыі неабходна зарабіць грошы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што неабходна вырашаць праблему скарачэння запасаў гатовай прадукцыі і павышаць рэнтабельнасць вытворчасці.

БЕЛТА.

Вынікі інфармацыйнага года

Учора ў Мінску прайшла калегія Міністэрства інфармацыі, на якой былі падведзены вынікі працы галіны летась і разгледзеліся планы на 2008 год.

Паводле слоў міністра інфармацыі Уладзіміра Русакевіча, летась галіна выканала 9 з 10 прагнозных паказчыкаў. Гаворачы пра паліграфічную галіну, міністр адзначыў, што летась рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі павялічылася і склала амаль 15 працэнтаў.

Што датычыцца праблем паліграфіі, то «шлях нумар адзін» для паліграфкамбіната імя Я. Коласа — гэта рэалізацыя часткі дзяржаўных акцый выдавецтву «АСТ» (Масква). Гэтае расійскае выдавецтва гатовае на працягу бліжэйшых 10 гадоў укласці ў развіццё паліграфкамбіната каля 14 млн еўра.

Летась самая сур'ёзная ўвага міністэрства надавалася «ўмацаванню фінансава-эканамічнага стану газет і часопісаў», а таксама павышэнню ўзроўню іх акупнасці. Паводле папярэдняй інфармацыі, рэдакцыі атрымалі прыбытку на суму 14,8 млрд рублёў. Гэта на 32 працэнты больш, чым у 2006 годзе. У той жа час затраты на выданне былі большыя — 19 млрд. Колькасць рэдакцый мясцовага друку, якія па выніках года спрацавалі з прыбыткам, узрасла — іх было 24.

Гаворачы пра электронныя СМІ, міністр адзначыў, што асноўнай задачай айчынных рэспубліканскіх тэлеканалаў сёння з'яўляецца павелічэнне ўласнага прадукту.

Летась, паводле слоў Уладзіміра Русакевіча, вялася праца па пашырэнні сеткі кабельных аператараў і асноўнага пакета праграм. Сёння аператарамі транслюецца каля 100 замежных тэлеканалаў, прыкладна палова з якіх — расійскія.

На працягу апошніх трох гадоў Міністэрства інфармацыі праводзіла штотыднёвы маніторынг FM-эфіру ў краіне на наяўнасць 70 працэнтаў беларускага прадукту. Сёння ж, на думку міністра, «выхаваўчы працэс ужо скончаны» і «замеры можна памяншаць».

Аўдыторыя спадарожнікавага тэлеканала «БеларусьТБ» сёння налічвае каля 7 млн чалавек. На думку міністра, гэта «вялікі поспех», улічваючы, што каналу толькі 3 гады.

У той жа час, паводле слоў Уладзіміра Русакевіча, існуюць праблемы з распаўсюджваннем канала ў Расіі. «Асабліва ў Маскве, у кабельных сетках». Каб вырашыць гэтую праблему, Беларусь мае намер падпісаць міжурадавае пагадненне аб дзейнасці СМІ (уключаючы тэлеканалы) у Саюзнай дзяржаве.

Сёння ў Беларусі зарэгістравана 1266 друкаваных СМІ, 156 — радыё- і тэлепраграм. Пачынаючы з 1996 года было анулявана 1214 пасведчанняў аб рэгістрацыі. На думку міністра, «гэта натуральны працэс рэгістрацыі, пазбаўлення ліцэнзіі і спынення існавання».

Сёлета міністэрства вынесла 86 пісьмовых папярэджанняў 76 выданням за парушэнні заканадаўства. Дзейнасць трох выданняў прыпынялася тэрмінам на тры месяцы. «Я лічу, што створаны ўсе неабходныя ўмовы для існавання і працы СМІ ў Беларусі. А калі нехта парушае закон, то ён нясе за гэта адказнасць. Вось і ўсе каментарыі».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

У СТВАРЭННІ МЫТНАГА САЮЗА АДБЫЎСЯ ІСТОТНЫ ПРАРЫЎ

Беларусь, Расія і Казахстан падпісалі пакет пагадненняў аб фарміраванні Мытнага саюза. Учора ў Маскве прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, прэм'ер-міністр Расіі Віктар Зубкоў і прэм'ер-міністр Казахстана Карым Масімаў падпісалі 9 дакументаў.

У стварэнні Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана адбыўся істотны прарыў. Аб гэтым заявіў беларускі прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, каментуючы вынікі пасяджэння Міждзяржсавета ЕўрАзЭС на ўзроўні кіраўнікоў урадаў.

Сяргей Сідорскі растлумачыў, што ўсяго для завяршэння фарміравання Мытнага саюза неабходна падпісаць 30 пагадненняў. Чатыры з іх былі раней падпісаны прэзідэнтамі трох краін, яшчэ дзевяць — учора прэм'ер-міністрамі Беларусі, Расіі і Казахстана. Астатнія дакументы, паводле слоў беларускага прэм'ера, будуць падпісаны на працягу бліжэйшых двух гадоў.

Ён таксама падкрэсліў, што наступным важным крокам на шляху фарміравання Мытнага саюза стане стварэнне Камісіі Мытнага саюза — наднацыянальнага органа, якому паступова будуць перададзены паўнамоцтвы па рэгуляванні знешнегандлёвай дзейнасці краін-удзельніц.

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі выказаўся за неабходнасць прыняцця далейшых мераў па фарміраванні Саюзнай дзяржавы. Аб гэтым ён заявіў у Маскве ў час сустрэчы з прэм'ер-міністрам Расіі Віктарам Зубковым.

Сяргей Сідорскі адзначыў, што далейшаму збліжэнню Беларусі і Расіі будуць садзейнічаць рашэнні, прынятыя кіраўніком беларускай дзяржавы Аляксандрам Лукашэнкам у канцы мінулага года, у прыватнасці, яны далі магчымасць на 95 працэнтаў уніфікаваць мытныя тарыфы, дзеючыя ў Беларусі і Расіі.

БЕЛТА.

Залатыя галасы Палесся

Вядомы на Брэстчыне фальклорны калектыў «Лабчанка» з вёскі Лобча Лунінецкага раёна — як адна сям'я — музычны, спеўны. Яны часта збіраюцца разам не толькі на канцэртных пляцоўках. Душа гэтай сям'і, лепшы народны голас Лунінеччыны — Настасся Якавец.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ГРЫП У «НАСТУПЕ»

Паводле інфармацыі рэспубліканскай санэпідслужбы, на 25 студзеня да ўжо «грыпуючых» тэрыторый далучыліся таксама Брэст, Барысаў, Свіслацкі, Ашмянскі, Бераставіцкі, Мастоўскі, Шчучынскі і Барысаўскі раёны. За адзін дзень, 24 студзеня, у кантрольных гарадах па медыцынскую дапамогу звярнуліся 13 195 чалавек, з якіх больш за палову складаюць дзеці ва ўзросце да 15 гадоў. У сувязі з адсутнасцю больш як 30 працэнтаў навучэнцаў, навучальны працэс спыніўся ў 6 установах адукацыі (у Слуцкім, Любанскім, Старадарожскім, Дзятлаўскім раёнах, у Лідзе і ў Фрунзенскім раёне г. Мінска), а таксама ў двух дзіцячых садках у Старых Дарогах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЗІМА. ЧАС САДЗІЦЬ ДРЭВЫ

Гамяльчане здзівіліся, калі ўбачылі, як на вуліцах горада пачалася пасадка дрэў вышынёй да пяці метраў — дваццацігадовых туй. Спецыялісты сцвярджаюць, што дрэвы выдатна прыжывацца.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Да Br2200 за долар

Мяркуецца, што ў гэтым годзе курс амерыканскай валюты істотна не зменіцца і будзе знаходзіцца ў дыяпазоне 2100—2200 рублёў за долар.

Забеспячэнне ўстойлівасці нацыянальнай валюты, у тым ліку яе пакупной здольнасці і курса ў адносінах да замежных валют, стала адным з пытанняў, якое разглядалася ўчора на пашыраным пра'ўленні Нацыянальнага банка. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч, такім чынам зменіцца сёлета курс нашага рубля ў межах плюс-мінус 2,5 працэнта.

Як адзначалася на пасяджэнні, летась насельніцтва актыўна крэдытавалася банкамі. Так, напрыклад, у 2007 годзе ў параўнанні з папярэднім на будаўніцтва жылля выдадзена больш ільготных крэдытаў у 1,3 раза, запазычанасць фізічных асобаў па крэдытах на фінансаванне жылля, выдадзеных на агульных падставах, узрасла ў 1,46 раза, а па крэдытах на спажывецкія мэты — амаль у 1,5 раза.

Ігар ГРЫШЫН.

За крок да перамогі

Учора ў паўфінале Кубка чэмпіёнаў Садружнасці БАТЭ ўступіў азербайджанскаму "Хазару" — 1:2. Гол у складзе беларусаў забіў Віталь Радзівонаў (ён зраўняў лік на 72-й хвіліне).

Ірына АНАТАВА.

«Прафтэхшколе трэба вяртаць аўтарытэт»

«Апошнім часам прыярытэты ў сферы адукацыі змясціліся ў нашай краіне ў бок вышэйшай школы. Агульнаадукацыйная школа ледзьве не з першага класа нацэльвае сваіх вучняў на паступленне ў ВНУ. А сістэма прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі пераўтварылася ў нейкую прамежкавую прыступку ў неперарыўнай адукацыі», — такую думку выказала на калегіі Міністэрства адукацыі, дзе падводзіліся вынікі дзейнасці галоўнага адукацыйнага ведамства за 2007 год, начальнік упраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга. На думку Ірыны Дрыгі, сістэме прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі трэба вяртаць ранейшы аўтарытэт, таму што ў Беларусі сёння востра не хапае рабочых кадраў і спецыялістаў сярэдняга звяна: «Прафесійна-тэхнічную і сярэднюю спецыяльную адукацыю маладыя людзі разглядаюць як не зусім паўнавартасную — такое становішча трэба змяняць. Увогуле ўсім нам трэба задумацца, а ці патрэбная нам масавая вышэйшая адукацыя? Магчыма, ВНУ праследуюць меркантыльныя мэты, пераўтвараючы вышэйшую адукацыю ў адукацыю для агульнага развіцця без уліку запатрабаванасці выпускаемых спецыялістаў і рэальных патрэбаў рынку працы? Абсалютна відавочна, што будучыня — за інжынернымі кадрамі».

Паводле даных сацыялагічнага даследавання, галоўнымі фактарамі, якія ўплываюць на зніжэнне цікавасці дзяцей да навучання ў школе, паводле меркавання бацькоў, вучняў і педагогаў, з'яўляюцца празмерна складаныя вучэбныя праграмы і падручнікі. «У сувязі з гэтым у нас узнікае заканамернае пытанне: «А ці ўсё мы зрабілі для змяншэння вучэбных нагрузак на нашых дзяцей?» Нас запэўніваюць у тым, што на 30 працэнтаў былі палегчаны вучэбныя праграмы, але ці так гэта? Упэўненасці няма, — падзялілася сваімі сумненнямі Ірына Дрыга. — Увогуле, на маю думку, дзеці павінны самастойна асвойваць вучэбную праграму без прыцягнення бацькоў і дапамогі рэпетытараў...».

Паколькі ў наступным навучальным годзе старшая ступень 12-гадовай школы плануе пераходзіць на профільнае навучанне, Ірына Дрыга засяродзіла ўвагу членаў калегіі на наступных праблемах: «Ці будзе школа пры ўкараненні профільнага навучання заўсёды ўлічваць інтарэсы дзяцей або гэта будзе навучанне па нарадцы? Ці зможам мы заўсёды забяспечыць дастаткова высокі кадравы ўзровень і належны ўзровень матэрыяльна-тэхнічнай базы? Магчыма, варта падумаць над тым, каб школа арыентавалася, як і раней, на ўсіх вучняў, якія маюць розныя здольнасці і розныя жыццёвыя планы, а навучанне асабліва адораных дзяцей варта ажыццяўляць у гімназіях і ліцэях?»

Надзея НІКАЛАЕВА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЯ ВЫСЫЛАЕ ЛАТВІЙСКАГА ДЫПЛАМАТА

Супрацоўнік пасольства Латвіі ў Маскве абвешчаны персонай нон грата, у двухдзённы тэрмін яму прадпісана пакінуць тэрыторыю Расійскай Федэрацыі.

МЗС Расіі сцвярджае, што дзейнасць пасла была несумяшчальная са статусам дыпламата і наносіла ўрон інтарэсам бяспекі РФ. Імя і пасаду дыпламата МЗС не называе.

ДЭВІД БЭКХЕМ — ПАГРОЗА НАВАКОЛЬНАМУ АСЯРОДДЗЮ



Брытанскі футбаліст Дэвід Бэкхем і яго сям'я аказваюць крайне негатыўны ўплыў на навакольнае асяроддзе. Да такой высновы прыйшла экалагічная арганізацыя Carbon Trust.

Згодна са складзеным эколагамі рэйтынгам, які ацэньвае шкоду, што наносіць навакольнаму асяроддзю канкрэтная асоба, на долю Бэкхема ў год прыпадае 163 тоны вуглякіслага газу, які выкідваецца ў атмасферу. У радавога жыхара Вялікабрытаніі гэты паказчык не перавышае 9,4 тоны на год. Такі значны негатыўны ўплыў футбаліста на навакольнае асяроддзе эколагі тлумачаць стылем жыцця зоркі. Бэкхем у 2007 годзе праляцеў больш за 400 тысяч кіламетраў на самалётах паміж Брытаніяй і ЗША, дзе ён гуляе за адзін з футбольных клубаў. Яшчэ 80 тысяч кіламетраў летась футбаліст і яго жонка праляцелі дзеля таго, каб узяць удзел у рэкламных кампаніях і свецкіх мерапрыемствах. Самалёты, як адзначаюць складальнікі рэйтынгу, выкідваюць у атмасферу значную колькасць вуглякіслага газу. Негатыўны ўплыў на навакольнае асяроддзе Бэкхемы ўзмацняюць сваім аўтапаркам — яны валодаюць 15 аўтамабілямі з магутнымі рухавікамі. Акрамя таго, сям'і належаць некалькі велізарных асабнякоў, якія спажываюць многа электраэнергіі, вады і іншых рэсурсаў.

НЯВЕСТА ПРЭЗІДЭНТА ФРАНЦЫІ СФАТАГРАФАВАЛАСЯ ГОЛАЙ

Былая мадэль, спявачка і нявеста прэзідэнта Францыі Нікаля Сарказі Карла Бруні знялася голай для іспанскага мужчынскага часопіса «DT».

Цікава, што на фатаздымку на безыменным пальцы Бруні бачны заручальны пярсцёнак, які многія СМІ прынялі за сведчанне аб замоўцы ці шлюбе мадэлі з прэзідэнтам. Прадстаўнікі «DT», аднак, сцвярджаюць, што фатаздымкі былі зроблены задоўга да рамана Сарказі і Бруні.

ДЛЯ КАСМІЧНЫХ ТУРЫСТАЎ

У Нью-Йорку кампанія Virgin Galactic прадставіла карабель для субарбітальных палётаў.

Судна SpaseShipTwo зможа дастаўляць да 8 чалавек (2 пілоты і 6 пасажыраў) за рэйс на вышыню ў 110 кіламетраў. Палёт будзе працягвацца 2 гадзіны, да камерцыйных палётаў пяройдуць праз 12 месяцаў пасля завяршэння выпрабаванняў. Кошт білета складзе 200 тысяч долараў. Праект гатовы на 60 працэнтаў і будзе завершаны да 2010 года. Запуск апарата будзе здзяйсняцца з самалёта.



КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион по продаже в Пуховичском районе обращенного в доход государства имущества:

- здание конторы общей пл. 258,5 кв.м, д. Пуховичи, ул. Садовая, д. 22. Начальная цена – 55 924 899 бел. рублей;

- здание свинарника № 1 общей пл. 556,5 кв.м, д. Габриелевка. Начальная цена – 67 927 899 бел. рублей.

Начальные цены снижены на 20 %. Подробные извещения опубликованы в газетах «Звязда» от 21.04.2007 г. и 08.08.2007 г. Аукцион состоится 14.02.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 13.02.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Слуцком райисполкоме, проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства: производственного корпуса (об. пл. 279,7 кв.м), расположенного по адресу: г. Слуцк, ул. Богдановича, 10. Начальная цена — 120 000 000 белорусских рублей. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Объект продается без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 04.03.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 03.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34,
Сайт в Интернете: www.rlt.by УНП 690324015

Дайце вучоным прававую базу!

Навукі на прадпрыемстве не бачна, аднак яе адсутнасць там вельмі заўважная.

З гэтага тэзіса пачаў сваю размову з журналістамі напярэдадні Дня беларускай навукі першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пётр Віцязь.

«У нас няма прававой асновы для інавацыйнага развіцця краіны, — паведаміў Пётр Віцязь. — Ёсць асобныя дакументы, аднак няма цэласнай сістэмы, у тым ліку наконт абароны інтэлектуальнай уласнасці. Мы сёння ўмеем лічыць, колькі каштуе жалеза, аднак колькі каштуе ноўхаў і тэхналогія — не. Адпаведныя методыкі існуюць, але не ўзаконены сам прынцып, а гэта значна тармозіць інавацыйны шлях. Мы не можам перадаць распрацоўку тым, хто сёння мае жаданне ўкласці ў яе грошы, прыйсці на наш рынак, арганізаваць тут вытворчасць. Для гэтага няма адпаведнай прававой асновы».

З ім пагадзіўся намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Ігар Войтаў. Ён паведаміў, што ў мінулым годзе Міністэрствам адукацыі і аблвыканкамамі былі прыняты рашэнні па стварэнні і развіцці шэрагу навукова-тэхналагічных паркаў у рэгіёнах, аднак ажыццяўленне гэтыя задумы не атрымалі па прычыне іх нестыкоўкі з палажэннямі Грамадзянскага кодэкса. Ён не прадугледжвае для дзяржаўных установ, якімі з'яўляюцца ВНУ, права стварэння навукова-тэхналагічных паркаў і іншых інавацыйных прадпрыемстваў, чыя дзейнасць скіравана на атрыманне прыбытку. Гэтая праблема абмяркоўвалася і на Першым з'ездзе вучоных. «Нам патрэбны нарматыўны дакумент, які прадаставіў бы ВНУ права актыўна ўдзельнічаць у фарміраванні інавацыйнай інфраструктуры», — падкрэсліў Ігар Войтаў.

Інга МІНДАЛЁВА.

27 студзеня — Міжнародны дзень памяці ахвяраў Халакоста

ПАМЯЦЬ ЯК УРОК

У нядзелю па ўсім свеце пройдуць мерапрыемствы, прысвечаныя Дню памяці ахвяраў Халакоста. У Мінску заўтра з гэтай нагоды ў Рэспубліканскім Палацы культуры ветэранаў (вул. Я. Купалы, 21) а 13-й гадзіне збяруцца прадстаўнікі міжнародных і грамадскіх арганізацый, былыя вязні і воіны-вызваліцелі Асвенціма, усе, каго хвалюе тэма Халакоста, каб яшчэ раз успомніць тое, што ніколі не павінна паўтарыцца.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мая КРАПІНА (ЛЕВІНА) — малалетняя вязніца Мінскага гета. Яе маці была закатавана падчас першага пагрому ў гета.

Міжнародны дзень памяці ахвяраў Халакоста аб'яўлены Генеральнай Асамблеяй ААН у 2005 годзе. Дата абрана ў памяць аб вызваленні 27 студзеня 1945 года Савецкай арміяй самага буйнога нацысцкага лагера смерці Асвенцім-Біркенау (Польшча). За гады вайны ў падобных лагерах было знішчана 60 працэнтаў яўрэяў Еўропы і прыкладна 35 працэнтаў яўрэйскага насельніцтва ўсяго свету.

Трагедыю Халакоста перажыла і Беларусь. З 1941 па 1944 год тут былі закатаваны каля 800 тысяч яўрэяў. У Мінскім гета, адным з самых буйных у Еўропе, знаходзілася больш за 100 тысяч вязняў.

— У Беларусі былі арганізаваны больш за 250 гета, — расказала карэспандэнту «Звязды» Іна ГЕРАСІМАВА, старшыня Грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі фонд «Халакост». — Мы зараз складаем карту яўрэйскіх гета, работа вельмі вялікая, яна доўжыцца ўжо два гады і яшчэ не завершана. Даводзіцца шмат удакладняць, выязджаць на месцы, шукаць сведкаў, рабіць запыты ў архівы. Тут нам каласальную дапамогу аказвае Нацыянальны архіў Беларусі. Увогуле, мы складаем чатыры карты: яўрэйскія гета, месцы масавага знішчэння, падпольныя арганізацыі ў гета і зоны дзейнасці партызанскіх атрадаў, у якіх была значнай доля яўрэяў. Усё гэта разам адлюстроўвае найбольш поўна гісторыю яўрэйскага народа на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Гэтыя карты, якія ўвесь час удакладняюцца, і іншы багаты матэрыял на тэму Халакоста знаходзяцца ў Музеі гісторыі яўрэяў на Беларусі (Мінск, вул. В. Харужай, 28). Работа сапраўды праводзіцца вялікая, і, нягледзячы на тое, што пасля вайны прайшло больш за 60 гадоў, ёй не бачна канца. Работа гэта патрэбная не толькі дзеля пашаны памяці нявінна забітых. Не толькі дзеля аднаўлення гістарычнай праўды. Самае галоўнае — дзеля таго, каб моладзь ведала, што такое ў чалавечай гісторыі было — людзей забівалі з-за прыналежнасці да іншай нацыянальнасці. І кожны чалавек адказны за тое, каб падобнае не паўтарылася.

Галоўная мэта Міжнароднага дня памяці ахвяраў Халакоста — стымуляванне адукацыйных праграм на гэту тэму, падкрэсліла Іна Герасімава. У Беларусі апошнім часам Міністэрства адукацыі робіць значныя крокі для таго, каб школьнікі і студэнты ведалі пра Халакост больш. У снежні стартаваў падтрыманы адукацыйным ведамствам Другі рэспубліканскі конкурс для ўсіх навучальных устаноў Беларусі «Халакост: гісторыя і сучаснасць. Урокі талерантнасці». Пра ўмовы конкурсу можна даведацца на сайце Мінскага яўрэйскага абшчыннага дома (www.meod.by) у раздзеле «Рэспубліканскі фонд «Халакост».

— Мы праводзім экскурсіі для школьнікаў і семінары для настаўнікаў, якія хочуць дапоўніць інфармацыю, дадзеную ў падручніках па гісторыі, — дадала Іна Герасімава. — Напрыканцы мінулага года прысвячалі семінар у Навагрудку яўрэйскаму супраціўленню. У Навагрудку яно было адным з самых значных. У сакавіку плануем правесці сустрэчу ў Бабруйску, прысвечаную закатаваным дзецям, і прывезці настаўнікаў да нядаўна адкрытага помніка ў Красным Беразе.

Разам з настаўнікамі Рэспубліканскі фонд «Халакост» задумаў стварэнне каталога помнікаў ахвярам Халакоста на тэрыторыі Беларусі. Аказалася, што такой базы даных няма, а ў нас ёсць нямала значных помнікаў, пра якія амаль ніхто не ведае. Для стварэння каталога трэба сфатаграфаваць кожны памятны знак, сабраць пра яго звесткі і знайсці інфармацыю пра падзеі, якім ён прысвечаны. Гэта вялікая работа, ажыццявіць якую можна толькі пры ўдзеле ўсёй грамадскасці.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Па чутках і аўтарытэтна

ДАХОД З РЫЗЫКАЙ...

Высокі працэнт — не гарантыя яго атрымання



Надзея хутка пабагацець, мабыць, сыграла злы жарт ні з адным нашым суайчыннікам. Прычым часта даверлівыя людзі ўкладваюць свае грошы ў нейкі праект, таму што шчыра вераць — альтруістаў нашмат болей, чым гэта ёсць насамрэч. І страчваюць пачуццё рэальнасці. Чым гэта заканчваецца — па адказ далёка хадзіць не трэба: чытачы больш сталага ўзросту памятаюць вакханалію вакол тых жа «фінансавых пірамід», калі абяцанні аб казачна высокіх працэнтах літаральна «зносілі» галовы ў грамадзян, а ўрэшце атрымліваўся гучны «пшык». Для многіх ацвярэзнение наступала толькі тады, калі даводзілася падлічваць панесеныя ўрон і класці на паліцу зубы.

Расчароўвацца ж, пагадзіцеся, заўсёды цяжка. А для таго каб па максімуму ўратаваць сябе ад такога непрыемнага пачуцця, здаецца, патрэбна няшмат — добра падумаць, перш чым прыняць нейкае канчатковае рашэнне. Між іншым, з апошнім у нас павінна быць усё ў парадку — нездарма ж беларусы лічацца разважлівымі людзьмі.

А цяпер, як кажуць, мы і падышлі да галоўнага: як высвятляецца, сёння ўсё больш нашых жыхароў праяўляе цікавасць да ўкладання сваіх сродкаў у расійскія паявыя інвестыцыйныя фонды (ПІФы). Пацвярджаецца гэта і інфармацыяй, якую мы атрымалі ў Нацыянальным банку Беларусі: менавіта тут фіксуецца найбольшая колькасць зваротаў з пытаннямі людзей аб парадку ажыццяўлення аперацый па пераводзе грашовых сродкаў у ПІФы — гэта грамадзяне, якія легальна спрабуюць укласці свае сродкі з мэтай зарабіць. Праўда, як паказвае практыка, іншыя на свой страх і рызыку едуць у суседнюю краіну з наяўнасцю, каб не марнаваць час на атрыманне дазволу (яго выдае галоўны банк у адпаведнасці з Законам «Аб валютным рэгуляванні і валютным кантролі»), і на месцы інвестуюць грошы ў даходную справу. І часам развітваюцца не з «лішкамі», а вязуць апошнія грошы, якія выкройваюць з сямейнага бюджэту, не ўлічваючы таго факта, што размова ідзе пра доўгатэрміновыя, а галоўнае — рызыкоўныя ўкладанні. Выходзячы з апошняга, спецыялісты Нацыянальнага банка і вырашылі звярнуць увагу насельніцтва на некаторыя асаблівасці, якія звязаны з такім інвеставаннем. У прыватнасці, разабрацца з сітуацыяй нам дапамог начальнік Галоўнага ўпраўлення валютнага рэгулявання і валютнага кантролю Нацыянальнага банка Анатоль Мароз.

Па-першае, што ж такое ПІФ? Паявы інвестыцыйны фонд — гэта аб'яднаныя сродкі, якія грамадзяне і юрыдычныя асобы перадаюць у давяральнае ўпраўленне кіраўнічай кампаніі з мэтай атрымання прыбытку. Прасцей кажучы, гэта спосаб для прыватнай асобы атрымаць ад укладання ў каштоўныя паперы такія ж выгады, якія атрымліваюць буйныя інвестары — банкі, кампаніі, фонды. Чалавек купляе пай фонду, а далей, як кажуць, справа тэхнікі. Калі надыходзіць устаноўлены тэрмін і можна забраць свае грошы назад, вы атрымліваеце разам з укладзенымі грашамі і працэнт, які атрымаўся за гэты перыяд. І вось тут некаторыя ўкладчыкі і могуць сутыкнуцца з нечаканасцямі...

— У Расіі ПІФаў — сотні, — распавядае аб некаторых акалічнасцях інвеставання ў паявыя інвестыцыйныя фонды Анатоль Мароз. — І пры такой прапанове выбраць патрэбны ПІФ надзвычай складана нават прафесіяналам фондавага рынку, не кажучы ўжо пра тых, хто не мае спецыяльных ведаў па пытаннях абарачэння каштоўных папер і інвеставання. Улічваючы ж той факт, што аперацыі па набыцці паёў паявых інвестыцыйных фондаў РФ звязаны з высокай ступенню рызыкі, укладанне грошай з мэтай атрымання высокай даходнасці можа быць звязана з рызыкай страты гэтых сродкаў. Да таго ж, заяўленая ПІФамі вялікая даходнасць па грашовых сродках, якія размяшчаюцца, спрыяе росту інтарэсу да такога віду актываў, часам ажыятажнаму, што, як правіла, характэрна для высокарызыкоўных аперацый.

Зазначу, што кошт паёў з часам можа як павялічвацца, так і памяншацца, паколькі змяняецца рынкавы кошт каштоўных папер у складзе маёмасці фонду. Менавіта таму ўладальнікі інвестыцыйных паёў нясуць рызыку страт, звязаных са змяненнем кошту паёў. Даходнасць ПІФаў НЕ ГАРАНТУЕЦЦА НІ ДЗЯРЖАВАЙ, НІ КІРАЎНІЧАЙ КАМПАНІЯЙ. Кіраўнічая кампанія таксама не мае права прадстаўляць нейкія гарантыі, абяцанні і прапановы аб будучай эфектыўнасці і даходнасці яе інвестыцыйнай дзейнасці. Праблемным момантам з'яўляецца таксама і ацэнка статусу надзейнасці паявога інвестыцыйнага фонду, упраўляючай кампаніі.

Самае важнае, што неабходна ведаць аб ПІФах — гэта тое, што яны не даюць ніякіх гарантый сваім пайшчыкам. Любыя віды паявых інвестыцыйных фондаў (адкрытыя, інтэрвальныя, закрытыя) не могуць паводле заканадаўства даваць якія-небудзь гарантыі па даходнасці і нават проста па збяражэнні капіталу. Акрамя таго, заяўленая даходнасць не можа быць пастаяннай і захоўвацца на доўгатэрміновы перыяд, так як фондавы рынак напрамую залежыць ад стану эканомікі краіны. Трэба адзначыць, што дынаміка ставак на рынку таксама не можа ісці заўсёды ўверх. Такім чынам, наш грамадзянін, выступаючы інвестарам, самастойна нясе абавязкі і рызыкі, звязаныя з укладаннем інвестыцый у паявыя інвестыцыйныя фонды.

Вы гатовыя рызыкнуць?..

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08016

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.01.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 168,24
1 латвійскі лат	4 543,05
1 літоўскі літ	917,12
1 чэшская крона	122,53
1 польскі злоты	876,94
1 расійскі рубель	87,98
1 украінская грыўня	423,88

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,4386
10 UAH	47,9536
1000 BYR	11,3450
EUR	36,0714

Курс у гандлёвых кампаніях (на 25.01.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Прамая лінія

МАЯ СЯМ'Я: АД ДАПАМОГІ ДА ЖЫЛЛЯ

(Працяг. Пачатак у нумарах за 23—25 студзеня.

— Патлумачце, калі ласка, калі пачнецца дзеянне Указа № 585, які датычыцца пагашэння няльготных крэдытаў маладым сем'ям з дзецьмі?

Святлана ДЗЯНІСІК, *г. Мінск*

— Указ № 585 працуе ўжо зараз. Прычым для атрымання дапамогі па пагашэнні камерцыйных крэдытаў жыхарам Мінска трэба звяртацца ў службу «адно акно» адміністрацыі свайго раёна.

— Дачка адна выхоўвае дзіця, тым часам як былы муж працуе недзе ў Расіі. Ці можна яго знайсці і спагнаць аліменты? І другое пытанне. Ці можа дачка, калі яна возьме другі шлюб, разлічваць на льготы па чарзе пры паляпшэнні жыллёвых умоў як маладая сям'я?

Людміла Міхайлаўна, *Стаўбцоўскі раён*

— Каб знайсці былога мужа, трэба абвясціць яго ў вышук, а для гэтага — звяртайцеся ў органы ўнутраных спраў. І, дарэчы, вераголднасць таго, што былы муж знойдзецца, вялікая — Беларусь і Расія маюць двухбаковы дагавор аб узаемнай прававой дапамозе.

А зараз па другім пытанні. Вашу дачку, яе дзіця і другога мужа на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў як маладую сям'ю ўжо не паставяць. Гэта правіла датычыцца толькі мужа і жонкі, якія ўзялі першы шлюб, нават нягледзячы на тое, што дачка і яе другі муж не маюць 31 года.

Прычым варта заўважыць, што зараз права на першачарговае паляпшэнне жыллёвых умоў у маладых сем'яў у нас няма — такія льготы былі толькі да 2000 года. Стаяць у любым выпадку тут давядзецца ў чарзе агульнай.

— Якія льготы зараз маюць непаўналетнія дзеці-інваліды? І ці мае сям'я з дзіцем-інвалідам права на сацыяльнае жыллё?

Людміла Рыгораўна МАЛАШОНАК, *Ушацкі раён*

— Згодна з Законам «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян» з 17 снежня мінулага года да дзяцей-інвалідаў няма толькі ранейшай скідкі па міжгароднім транспарце, а ўсё астатняе па сутнасці засталося без зменаў. Што ж да сацыяльнага жылля, то магчымасць яго атрымання ў сям'і з дзіцем-інвалідам ёсць. Але толькі пры ўмове, што даход на кожнага члена такой сям'і не перавышае бюджэту пражыткovага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, або на сёння — 185 670 рублёў.

— У мяне адразу некалькі пытанняў. Па-першае, ці можа разлічваць на льготны крэдыт маладая, але нешматдзетная сям'я? Па-другое. Ці будзе лічыцца маладой сям'я, дзе мужу і жонцы спаўняецца па 31 году? І па-трэцяе. Ці прадстаўляецца маладым нешматдзетным сем'ям якая-небудзь палёгка па пагашэнні льготных крэдытаў?

Святлана, *г. Слонім*

— Разлічваць на льготны крэдыт маладая нешматдзетная сям'я можа, але выдавацца такі крэдыт будзе толькі па агульнай чарзе. Па-другое. Калі сям'я была пастаўлена на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых ўмоў як маладая, то маладой такая сям'я будзе лічыцца і пасля таго, як муж і жонка дасягнуць 31-гадовага ўзросту.

І па-трэцяе. Пры нараджэнні першага дзіцяці маладой сям'і сапраўды аказваецца фінансавая дапамога на пагашэнне льготнага крэдыту ў памеры 10 працэнтаў, а пры нараджэнні другога дзіцяці — у памеры 20 працэнтаў ад яго рэшты. Аднак варта заўважыць: такая дапамога прадастаўляецца толькі ў выпадку нараджэння, але не ў выпадку наяўнасці дзіцяці.

— Доўгі час знаходзіліся ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў як маладая сям'я, аднак калі ўрэшце сталі будавацца і ўзялі камерцыйны крэдыт, мне і жонцы ўжо споўнілася па 31 году. Ці можам мы разлічваць на дапамогу ў пагашэнні часткі крэдыту цяпер?

Мікалай БУРАЧКОЎСКІ, *г. Слуцк*

— Паколькі на момант пастаноўкі на ўлік ваша сям'я з'яўлялася маладой, то разлічваць на дапамогу ў пагашэнні няльготнага крэдыту пры наяўнасці непаўналетняга дзіцяці на падставе Указа № 585 можна.

— Патлумачце, калі ласка, пры наяўнасці непаўналетніх дзяцей няльготныя крэдыты маладым сем'ям пагашаюцца толькі ў «Беларусбанку» або ва ўсіх банках? І другое пытанне. Якія дакументы трэба збіраць для пагашэння камерцыйных крэдытаў і куды з гэтымі дакументамі звяртацца?

Аляксей Станіслававіч СЦЕПАНЕНКА, *Барысаўскі раён*

— Правіла пагашэння часткі няльготных крэдытаў маладым і шматдзетным сем'ям з непаўналетнімі дзецьмі не залежыць ні ад банка, ні ад таго, у якой валюце афармляўся сам крэдыт. Што да дапамогі, то па яе трэба звяртацца ў выканкамы па месцы жыхарства, куды неабходна прынесці заяву, копію пасведчання аб нараджэнні дзіцяці і копію крэдытнага дагавора.

—У свой час мы з жонкай пабудавалі долевым спосабам 1-пакаёвую кватэру плошчай 36 квадратных метраў з вызваленнем ад аплаты за інфраструктуру. Потым у нас нарадзіўся сын, мы зноў сталі ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў, і, магчыма, у хуткім часе зможам патрапіць у жыллёва-будаўнічы кааператыў, які фарміруецца па месцы работы жонкі. А пытанні такія. Па-першае, колькі метраў вызваляецца ад аплаты на інфраструктуру для сям'і з трох чалавек, якая будуецца ў ЖБК? Па-другое, з улікам ранейшага будаўніцтва, ці налічаць нам дадатковую аплату на інфраструктуру на 36 метраў — плошчу цяперашняй кватэры? І па-трэцяе — колькі складае зараз «надбаўка» на інфраструктуру за кожны «лішні» метр?

Пётр ЮЖАНІН, *г. Мінск*

— Зараз, паважаны Пётр, ніякіх даплат на інфраструктуру за «лішнія метры» ні для ЖБК, ні для долевага і нават камерцыйнага будаўніцтва ўжо не павінна быць. Паводле Указа № 72 ад 7 лютага 2006 года «Аб мерах па дзяржаўным рэгуляванні адносінаў пры размяшчэнні і арганізацыі будаўніцтва жылых дамоў, аб'ектаў інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры», фінансаванне, праектаванне і будаўніцтва аб'ектаў інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры робіцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, дарожных і іншых мэтавых фондаў.

Такім чынам, «лішнія метры» ўлічваюцца толькі пры вызначэнні памеру льготнага крэдыту.

— З 2006 года будуем кватэру спосабам ЖБК, прычым за гэты час у нашай сям'і нарадзілася дзіця. У сувязі з гэтым, ці павінны нам перараслічыць плацяжы на сацыяльную інфраструктуру за «лішнія» метры і вярнуць грошы?

Валянціна Мікалаеўна ЖАРТУН, *Мінскі раён*

— Калі гаворка ідзе аб «лішніх метрах» на інфраструктуру, то, Валянціна Мікалаеўна, па гэтым пытанні вам трэба зрабіць пісьмовы запыт у Мінскі райвыканкам.

(Працяг будзе.)

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.

Месцічы

МСЦІСЛАЎСКІЯ ПЛАНЫ

Новая вытворчасць

23-гадовы мсціслявец Яўген Дарожкін яшчэ нядаўна ездзіў у Расію працаваць будаўніком. Што ж, беларуска-расійская мяжа ад Мсціслава — рукой падаць, ды пляцілі нібыта нядрэнна, а ўсё ж, аднойчы вырашыў малады чалавек, надышоў час вызначацца з жыццём, працай і домам.

Яўген цяпер лічыць, што яму пашанцавала: праз службу занятасці ён уладкаваўся на новую вытворчасць мсціслаўскага прадпрыемства «Водаканал». Тут вырабляюць розныя жалезабетонныя рэчы: дэкаратыўныя агароджы і малыя архітэктурныя формы — скульптуры, якія выкарыстоўваюцца для ўпрыгажэння падворкаў і вуліц.

— Мне падабаецца мая праца: прыемна ісці па горадзе і бачыць зробленае сваімі рукамі, — гаворыць Яўген. — Заробкам я таксама задаволены. Так што і ў Расію ехаць не трэба!

Калега Яўгена — 27-гадовы Аляксей Косік. Ён увогуле мае вышэйшую адукацыю настаўніка фізкультуры, але жыццё распарадзілася так, што трэба зарабляць на сям'ю.

— Калі падвернецца нешта лепшае па спецыяльнасці — ніколі не позна памяняць працу, але і гэтым месцам я, паверце, задаволены, — гаворыць Аляксей. — Тут сістэма такая: колькі зрабілі, столькі і атрымайце. У сярэднім можна 500 тысяч рублёў зарабіць (у сезон і болей), што для райцэнтра вельмі нядрэнна.

Прадукцыя цэха карыстаецца папулярнасцю — гавораць, што бетонныя агароджы просяць і ў Расіі. Акрамя агароджаў з рознымі ўзорамі (нават з вінаградными гронкамі), тут прапануюць шышкі, вазы, пясочніцы, а яшчэ «каменныя жывёлы» — ільвы, слонікі, сабакі і каты.

— І не надта дарагое задавальненне, — дэманструе прадукцыю дырэктар «Водаканала» Уладзімір Стэфаняк. — Напрыклад, адзін пралёт бетоннай агароджы даўжынёй два метры каштуе для прыватніка 17 тысяч рублёў разам з устаноўкай. Дастаўляем мы свае вырабы ў межах Мсціслаўскага раёна бясплатна. Вялікі леў каштуе 18 тысяч, а слонік — 12 тысяч рублёў. І ў мяне дома такое ёсць!

Новая вытворчасць «Водаканала» дала гораду 10 новых працоўных месцаў. Абсталяванне беларускай і расійскай вытворчасці каштавала прадпрыемству 18 мільёнаў рублёў. І ўдалося абысціся без крэдытаў, уласнымі сродкамі.

Яшчэ адзін новы праект «Водаканала» — гэта брыгада па ачыстцы шахтных калодзежаў, паслугі якой запатрабаваныя сельвыканкамамі. А ў новых дамах, якія будуюцца ў аграгарадках, спецыялісты прадпрыемства будуць устанаўліваць сантэхніку. Гэта — новыя прыбыткі і новыя працоўныя месцы.

Інвестыцыйныя праекты

Увогуле ў Мсціслаўскім раёне сёлета плануецца адкрыць 85 новых працоўных месцаў.

— Не скажу, што ў Мсціславе лёгка знайсці працу, але гэта праблема бадай што ўсіх малых гарадоў, — разважае намеснік старшыні Мсціслаўскага райвыканкама Уладзімір Багданаў. — Вядома ж, мы гаворым пра добрае месца, дзе прыстойны заробак. Людзі трымаюцца за такую працу. Хоць сёння любы мужчына можа ўладкавацца будаўніком. Напрыклад, у адной будаўнічай арганізацыі працуе 320 чалавек, а можна браць да 700.

Але не кожны чалавек сёння хоча і можа стаць будаўніком. Для таго каб былі і іншыя магчымасці, ствараюцца новыя прадпрыемствы.

Галоўныя надзеі на адкрыццё новых прадпрыемстваў у Мсціславе звязваюць з двума інвестыцыйнымі праектамі. Яны з'явіліся, дарэчы, у выніку леташняга аўкцыёну па прыцягненні ў гаспадарчы зварот аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца больш за два гады.

— Калісьці ў нас працаваў камбінат надомнай працы, дзе шылі спецадзенне, — расказаў Багданаў. — Але абсталяванне састарэла, камбінат больш не даваў прыбытку. А цяпер з'явіўся інвестар — прадпрыемства «Расмадэрн». Яго ўладальнік — расіянін, але справа зарэгістравана ў Беларусі. Ужо сёлета ён плануе адкрыць швейную вытворчасць. Тут будуць вырабляць спецадзенне і жаночае верхняе адзенне, якое пойдзе на беларускі і расійскі рынкі. Там будзе створана як мінімум паўсотні новых працоўных месцаў, а ў перспектыве — і болей.

Другая прапанова паступіла ад жыхароў суседняга горада Крычава. Яны плануюць адкрыць у Мсціславе станцыю абслугоўвання аўтамабіляў, дзе можна будзе, акрамя іншага, прайсці і дзяржаўны тэхагляд. Там плануецца адкрыць дзесятак новых працоўных месцаў.

Распрацоўваюць свой інвестыцыйны план і мсціслаўскія прыватнікі: гэта будзе вытворчасць будаўнічых матэрыялаў. Што ж, будаўніцтва ў Беларусі і Расіі ідзе і павялічваецца, таму ад вытворчасцяў будматэрыялаў на памежжы можна атрымаць добры прыбытак.

Таму плануецца тэхнічнае пераўзбраенне завода па вырабе цэглы. І цяпер мсціслаўская цэгла карыстаецца вялікім попытам па абодва бакі мяжы: з яе робяць добрыя печкі.

Вялікая будоўля

Як паведаміў старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Алег Чыкіда, у межах выканання праграмы развіцця малых гарадоў сродкі будуць выдаткоўвацца на мадэрнізацыю асноўных прамысловых прадпрыемстваў райцэнтра. Гэта хлебазавод, маслазавод, ільнозавод і камбікормавы завод. Мэта — палепшыць якасць прадукцыі і паменшыць энергавыдаткі.

Яшчэ летась на мясцовым хлебазаводзе ўсталявалі замест маральна і фізічна састарэлага абсталявання новую лінію па разліве квасу ў ПЭТ-бутэлькі. Сёлета на кааператыўным нарыхтоўчым камбінаце запусцяць новую лінію па фасоўцы семак. На масласыробным заводзе запланавана ўстаноўка новых чанаў для сыраварні.

Хуткімі тэмпамі развіваецца будаўнічая галіна. У Мсціслаўскім раёне ёсць чатыры будаўнічыя арганізацыі, але мясцовымі сіламі выкананы дзве трэці леташняга аб'ёму работ. Астатняя частка — запрошанымі з іншых рэгіёнаў будаўнікамі.

— Тут вялікае поле дзейнасці, можна набіраць людзей, — лічыць Уладзімір Багданаў. — У нас шмат гастарбайтэраў, якія з'язджаюць у Маскву і Піцер. Наша задача — вярнуць іх дадому. Але для гэтага трэба даць ім працу і добры заробак. Фронт работ у нас вялікі — людзі будуюцца і ў вёсцы, і ў райцэнтры. Тут і жылыя дамы, і вытворчыя будынкі для сельскай гаспадаркі.

Рабочы Яўген ДАРОЖКІН: «Працай я задаволены, а з нашай прадукцыі мне найбольш падабаюцца скульптуры сімпатычных ільвоў».

Мсціслаўскія кіраўнікі не абыходзяць увагай і сельскую гаспадарку, якая дае сыравіну для перапрацоўчай прамысловасці горада. Аграрны сектар раёна развіваецца і павялічвае аб'ёмы прадукцыі.

Турыстычная «мека»

Мсціслаў — горад адметны. Нявопытнаму вандроўніку можна лёгка заблытацца ў раённых цэнтрах Усходняй Беларусі, якія часам падобныя адзін на аднаго: галоўная плошча насупраць райвыканкама, звычайна з помнікам Леніну, а навокал — колькі шматкватэрных дамоў і вялікі прыватны сектар.

Мсціслаў ні з якім іншым горадам не зблытаеш. На цэнтральнай плошчы стаіць помнік Пятру Мсціслаўцу, а навокал — разам з сучаснымі, — старажытныя будынкі.

Таму нездарма гавораць, што турызм — гэта вялікае будучае Мсціслава. Шматлікія помнікі гісторыі і архітэктуры проста павінны прыцягнуць сюды народ. Напрыклад, той жа самы Пустынскі манастыр, пра які нядаўна расказвала «Звязда». Людзі едуць, цікавяцца мсціслаўскай даўніной. Толькі музей у райцэнтры летась наведалі амаль 3,5 тысячы беларусаў і расіян.

— А яшчэ прырода якая! — зазначае Алег Чыкіда. — У нас ёсць усе ўмовы для развіцця аграэкатурызму. Асабліва калі ўлічыць, што чарнобыльская радыяцыя не кранула землі нашага раёна. Адзін прадпрымальнік у Аслянцы ўжо займаецца рамонтам памяшканняў і будаўніцтвам, каб людзі маглі прыязджаць і адпачываць.

— Я лічу, што ў будучым наш горад будзе турыстычным, — упэўнены Уладзімір Багданаў. — Трэба ўжо сёння меркаваць пра тое, дзе турысту можна рукі памыць і паесці. Ды і мясцовы народ хоча выбіраць з шырокага спектра тавараў і паслуг. Таму хочацца, каб у развіцці райцэнтра бралі ўдзел прыватнікі. Сёння ў нас сустрэцца з чалавекам за кубкам кавы праблематычна. Нам абавязкова патрэбна сучасная кавярня, хоць бы на 10—15 месцаў, і шмат чаго іншага.

Турызм і паслугі — гэта цяпер вельмі перспектыўна. У райцэнтры ёсць добрыя гасцініца і рэстаран, але сферу абслугоўвання трэба пашыраць.

Безумоўна, прадпрымальніку страшнавата выдаткаваць свае кроўныя грошыкі на новую, яшчэ нязведаную справу. Але трэба браць пад увагу, што турызм на Мсціслаўшчыне — гэта вялікае поле дзейнасці, і на ім пакуль няма вялікай канкурэнцыі.

Старшыня Мсціслаўскага райвыканкама таксама прызнаецца, што ў будучым бачыць Мсціслаў турыстычнай «Мекай». Разам з сельскай гаспадаркай і перапрацоўчымі прадпрыемствамі, гістарычны і экалагічны турызм, упэўнены Алег Чыкіда, дазволіць Мсціславу і раёну паспяхова развівацца.

— Каб былі праца і заробак, сацыяльная сфера, усе паслугі, — зазначае Алег Чыкіда. — Каб людзі жылі заможна і былі задаволеныя.

Ілона ІВАНОВА,
г. Мсціслаў

Факт

ШЧУПАКА І КАРПА — У БЛЯШАНКУ

Па сёння рыбагаспадарчае прадпрыемства «Белае», што ў Жыткавіцкім раёне, рэалізоўвала сваю сажалкавую прадукцыю ў асноўным, як гаворыцца, у жывым выглядзе.

Цяпер сітуацыя ў многім зменіцца. Бо тут пабудаваны цэх па перапрацоўцы рыбы (дарэчы, першы на Гомельшчыне). Дзякуючы гэтаму з'явілася магчымасць вырабляць паўфабрыкаты з рыбы.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Добры дзень, родныя словы!

ГОСПАДЗЕ, БОЖУХНА...

Студэнт другога курса Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Юрый Макарэвіч у сваім лісце ў рэдакцыю піша, што ў друку сустракаюцца дваякія напісанні Гасподзь і Госпад. «Якому напісанню Вы аддаяце перавагу?»

Якраз словаформе Госпад. За гэта стаяць шэсць склонаў: родны, давальны, вінавальны, творны, месны і клічны (ветлівая форма звароту). Госпада, Госпаду, Госпада, Госпадам, (аб) Госпадзе, (о) Госпадзе! Усе яны просяць на ганаровы пасад назоўнага склону слова Госпад.

Калі ж узяць Гасподзь, то адпаведна ў родным склоне напрошвалася б Гасподзя, што зусім ненатуральна.

Гісторыя гэтага слова сягае далёкіх часоў, і прыйшло яно з стараславянскай і царкоўнаславянскай моў разам з словамі хрысціянскай рэлігіі (прарок, грэх і інш.). З гонарам успомнім нашу Полацкую епархію, заснаваную ў 992 годзе. (Заўважым, Маскоўская епархія была заснавана ў 1742 годзе).

Але літаратурная мова беларускай нацыі складвалася без таго ўплыву стараславянскай і царкоўнаславянскай моў, які зазнала руская мова, дзе ў пэўны час нават пачалі на стараславянскі лад утвараць словы, якіх не было ў стараславянскай (драгоценный і інш.). А, напрыклад, словы **волат**, **колокол** дзеля надання ўзвышанасці ў рускай мове перабраліся ў влат, **клакол**.

Слова Госпад — адна з назваў Бога ў хрысціянскай рэлігіі — неад'емнае ад перакладаў Новага Запавету. А іх, беларускіх перакладаў, у адным мінулым, XX стагоддзі, дзякаваць Богу, было ўжо з дзесятак!

І тут не магу не адзначыць такую падзею, як пераклад Новага Запавету ксяндза Уладзіслава Чарняўскага. Ён якраз усюды ўжывае слова Госпад (і ў назоўным склоне) замест пашыранага ў каталіцтве слова Пан. (Варта згадаць і Янку Станкевіча, які ў пошуку спрадвечных беларускіх каранёў у перакладзе Дабравесця звяртаецца да свайго ўлюбёнага слова Спадар).

Аднак беларуская жывая народная і літаратурная мовы ўсё ж аддаюць перавагу слову Бог. (Я, як ужо, напэўна, заўважыў чытач, пішу гэтыя словы, незалежна ад розных іх ужыванняў, з вялікай літары). Дык вось цікава, што ў двухтомным «Фразеалагічным слоўніку беларускай мовы» І.Я. Лепешава вы не знойдзеце ніводнага фразеалагізма з словам Госпад, затое больш за 80 з словам Бог.

І ў гэтым відавочная розніца між беларускай і рускай мовамі. Калі ў рускай мове ёсць фразеалагізмы толькі з словам Господь або ёсць паралельныя фразеалагізмы, дзе **Господь** і **Бог** узаемна заменлівыя, то ў беларускай мове ганароце толькі слова Бог з рознымі суфіксальнымі пашанотамі — **Божачка, Божухна**, з рознымі прыметнікамі і інш.

Дзеля прыкладу прывядзём некалькі рускіх выслоўяў, дзе слова **Господь** ужыта пры выказванні здзіўлення, радасці або абурэння ці роспачы: Господи; ах ты Господи; Господи Боже мой. І як заспяшаліся для перадачы таго ж беларускія выразы: Божа; Божа мой; Божа мой літасцівы; Божачка; Божухна; Божухна—бацюхна; а Божухна ты мой, а бацюхна...

Мяне асабліва кранае гэты старажытны суфікс у слове **Божухна**. Адразу прыходзяць на памяць татухна, матухна, братухна, цётухна, дзядзюхна і з песняў — долюхна, бярозухна, дарожухна. І праз стагоддзі чуеш роспачны плач з Баркулабаўскага летапісу, з апісання вялікага голаду на ўсходзе Беларусі ў 1601—1602 гадах, калі ў ямах хавалі па 30—40 чалавек. Галодныя хадзілі, выпрошваючы ў чуць заможнейшых гаспадынь «крошку хлеба», «сільне, слёзне, горко мовілі так: матухно, зезюлюхно, ... , панюшка, спадарыня, солнце, месец, ... зорухно...».

А вось яшчэ шэраг рускіх выразаў з словам Господь для выказвання папярэджання, засцярогі ад чаго-небудзь нежаданага (няхай гэтага не здарыцца): Господи, Господь помилуй, упаси и помилуй; **избави, сохрани, упаси, не дай, не приведи Господи; упаси господи; избави Господь і іх блізкія беларускія адпаведнікі: не дай Бог (Божа); барані Божа (Божачка, Бог); не давядзі Бог; няхай Бог абносіць (бароніць, крые, мілуе, ратуе); хай Бог не дае; Божа збаў.**

Або калі для выказвання ўзмоцненай просьбы, мальбы, а то і ў значэнні **калі ласка, вельмі прашу** ў рускай мове нароўні з Богам чуеш і ўпамінанне Госпада: **ради (самого) Господа (Бога)**, то ў беларускай мове адзіна мажлівая спасылка толькі на Бога: **напрамілы Бог, Богам прашу, Хрыстом-Богам прашу**.

Для выказвання радасці, заспакаення, палёгкі, задавальнення з прычыны чаго-небудзь у рускай мове напашэе выслоўе: **слава те (тебе) Господи** (тое ж самае, што **слава Богу), па-беларуску выказваецца яно прыкладна так: хвала Богу, дзякуй Богу (дзякаваць Богу), хваліць Бога.** Таксама з ужываннем Божага імя.

Дык скончым яшчэ адным выслоўем:

— Памажы ўсім нам, Божа!

Анатоль КЛЫШКА.

ВЯРНУЦЦА ДАДОМУ

МАРЫЦЬ АБСАЛЮТНАЯ БОЛЬШАСЦЬ НАСЕЛЬНІКАЎ ПРЫТУЛКУ

У сацыяльным прытулку ранішнікі бываюць не толькі на Новы год або Каляды. Знайшліся спонсары, прыйшлі равеснікі з прыёмных сем'яў — атрымалася яшчэ адно свята. Так было ў Драгічынскім сацыяльна-педагагічным цэнтры акурат на стары Новы год. Дзеці з радасцю чыталі вершы, з задавальненнем атрымлівалі падарункі. «Разам з малымі ўдзельнічаюць у мерапрыемствах падлеткі, і падобна на тое, робяць гэта з ахвотай...» — выказала сваё здзіўленне старшыня раённага Савета дэпутатаў Ганна Верамейчык. На што Вера Кузьменка запярэчыла: «І не дзіва! А што добрае яны бачылі ў сваім жыцці?»

Вера Данілаўна сем гадоў кіруе сацыяльна-педагагічным цэнтрам, у склад якога тры гады таму ўвайшоў прытулак. Лік гаротных дзяцей, што прайшлі праз яе рукі, пайшоў на сотні. Усе яны нешчаслівыя па-свойму.

Выхавальніца Людміла МАКСІМЧУК праводзіць заняткі з дашкольнікамі Дашай і Ленай

«Вам работы хопіць»

Сацыяльна-педагагічны цэнтр працуе з усімі праблемнымі сем'ямі раёна, якіх зараз 108. 248 дзяцей знаходзяцца, гаворачы моваю дакументаў, у сацыяльна небяспечным становішчы. Насамрэч гэта азначае, што бацькі п'юць або гуляюць, або тое і другое разам, а пра дзяцей ніхто не клапоціцца. І па сігналу ці то з сельсавета, ФАПа або званку суседзяў сацыяльны педагог садзіцца ў аўтобус, едзе ў вёску і спрабуе неяк уздзейнічаць на сям'ю. Разам з прадстаўнікамі органаў мясцовай улады, міліцыі, грамадскасці. Калі нічога не дапамагае, дзяцей забіраюць у прытулак, бацькам выносяць папярэджанні, заклікаюць узяцца за розум. Задача работнікаў цэнтра папярэдзіць крайнюю меру — пазбаўленне бацькоўскіх правоў, пастанову аб якой выносіць суд. Ды не заўсёды гэта ўдаецца. Як было, напрыклад, з грамадзянкай Піліпчук. Ужо ж няньчыліся з ёй, усяляк спрыялі, угаворвалі. Гуманітарнай дапамогі, галоўным чынам, вопраткі дома ў названай кабеты ўтварыўся цэлы склад. Як потым высветлілася, яна не абцяжарвала сябе тым, каб памыць дзіцячае адзенне. Стала бруднай куртка або нехта з малых на калене штаны прадраў — рэч выкідвалі ў камору, якая аказалася забітай па самую столь.

А пачатак біяграфіі ўказанай дамы быў цікавым. У Драгічынскі раён яна прыбыла з Расіі, мабыць, у пошуках шчасця. За нейкія два дзесяткі з невялікім гадоў нарадзіла 13 дзяцей і падарыла іх Рэспубліцы Беларусь. У прамым сэнсе. Жанчыну пазбавілі мацярынскіх правоў, непаўналетніх дзяцей накіравалі ў Кобрынскую дзіцячую вёску. Маці-выхавальніца з Кобрына расказвала, як першы раз сустрэла гэтых дзевяць дзетак, як пасадзіла за стол на абед. А яны сталі гаварыць, што не прывыклі есці суп у талерках. Яны звычайна адломвалі па кавалку каўбасы, які маці клала на стол, і хуценька з'ядалі з гурком. Таму некаторы час выхавальніца ставіла ім у якасці халоднай закускі каўбасу з гурком, праўда, парэзаную на кавалкі.

Ды і каўбаса была ў тым доме далёка не заўсёды, як высветлілі адказныя работнікі. Звычайна куплялася многа прадуктаў і выпіўкі пасля атрымання дапамогі на дзяцей, якая складала больш за мільён. Гэтага хапала на тыдзень-другі, а далей — з хлеба на квас альбо і наогул — зубы на паліцу. І ездзілі, і ўгаворвалі, вучылі амаль пяцідзесяцігадовую жанчыну, што трэба найперш рабіць запас крупаў, мукі, алею, сала, а не купляць дарагія мясныя далікатэсы. На добры толк у вясковай сям'і з такой колькасцю дзяцей трэба мець дзве каровы, пару свіней, вялікі агарод, і пры ўмове забеспячэння адзеннем з гуманітарнай дапамогі можна жыць. Але маці-«гераіня» да працы не прывыкла. Нараджала дзяцей, як лісты гартала, і дапамогу атрымлівала спраўна, пакуль ланцужок не перарваў суд.

На судзе яна ўсіх не прасіла здзівіла, зрэзала. На пасяджэнне з'явілася нібы графіня на баль, а не пагарджаная грамадствам асоба. Манікюр — еўрапейскі, сукенка — дарагая з дэкальтэ, прычоска — модная, — у сукупнасці з падоранай прыродай мілавіднасцю проста супярэчылі яе сутнасці. Трымалася яна ўпэўнена, не спалохала яе паведамленне аб тым, што павінна зарабляць грошы на ўтрыманне дзяцей. Яна так нічога і не зразумела, а можа, і не здольная зразумець. Калі заехалі да яе ўжо пасля адпраўкі дзяцей, засталі за чарговай гулянкай у кампаніі са старэйшай дачкой, якая, на жаль, у спадчыну атрымала не толькі мацярынскую прыгажосць. На стале была бутэлька, а за сталом — кавалер на дваіх.

Яшчэ адна асоба, падобная на апісаную вышэй, пасля суда нахабна заявіла спецыялісту па абароне правоў дзяцей раённага аддзела адукацыі Вользе Каменец: «Пакуль я жывая, вам, Вольга Іванаўна, работы хопіць». Траіх дзяцей у яе забралі, але яна, відаць, не збіраецца спыняцца на дасягнутым. Вольга Іванаўна расказала, якім чынам забіралі малых у прытулак. Маці прапала ў чарговым загуле, бабуля таксама адбыла ў Мінскую вобласць да сужыцеля. А дзеці засталіся пад замком у вясковай хаце. І пакольскі замок ламаць нельга, участковы інспектар змог неяк адчыніць акно. Дык вось старэйшы чатырохгадовы хлопчык падаваў праз акно меншых, разумеючы, што гэта іх выратаванне. Потым хуценька вылез сам. А звычайна ж дзеці плачуць, калі іх забіраюць з роднага, хоць і бяспутнага, дома.

«Каб не піла, у норкавым футры хадзіла б»

Вольга Каменец лічыць, што заканадаўства ў нас усё роўна мяккае ў дачыненні да няўдалых бацькоў. Каб змясціць дзяцей ў казённую ўстанову, трэба правесці шэраг даволі складаных працэдур, ажыццявіць мноства фармальнасцяў, пры гэтым забяспечыць максімальнае захаванне правоў тых, хто з'яўляецца біялагічнымі бацькамі. Потым яны павінны несці адказнасць. Ёсць нарматыўныя акты, якія абавязваюць зарабляць грошы і пералічваць на ўтрыманне дзяцей. Але на справе гэтага дабіцца складана. Некаторыя работадаўцы набілі гузакоў з такімі працаўнікамі. Звольніць іх па закону ніхто не мае права. А яны, здараецца, на работу не выходзяць, п'юць. Былі выпадкі падобных паводзінаў гарадацькоў у сельгаспрадпрыемствах раёна. Кіраўнікі іх прастаўляюць у табелі па 8 гадзін, інакш, кажуць, замучышся паперы пісаць у разнастайныя інстанцыі. Ну а зарабляе такі віртуальны работнік адпаведна сваім намаганням.

Нажыло праблем з гэтакім «кадрам» і гарадское аддзяленне паштовай сувязі. Уладкавалі жанчыну паштальёнам. Спачатку працавала без асаблівых заўваг, а потым сабрала грошай за падпіску з людзей ды і сышла ў запой. Ледзьве яе потым знайшлі і ўладзілі канфлікт.

Гэта ўласцівасць многіх маці, якія дружаць з гарэлкай — знікаць. Падобнае здарылася з сям'ёй старшакласніцы, адзін з якіх цяпер жыве ў прытулку. Да маці сваёй яны ставяцца трапятліва, як да хворага чалавека. Жылі, нібы баяліся спалохаць часовы спакой і лад. Бо яна, калі цвярозая, усё зробіць, усіх дагледзіць, суп змудруе амаль з сякеры. Так было апошнія паўтара года, з той пары, як у маці нарадзілася малодшае дзіця. А потым яна знікла. 16-гадовы хлопец са сваёй сястрой, навучэнкай гімназіі, даглядалі малога, як умелі. Па чарзе не хадзілі ў школу, пакуль настаўнікі не звярнулі ўвагу на пропускі. Тады малога забралі ў бальніцу, хлопца — у прытулак, дзяўчынцы ў парадку выключэння дазволілі жыць дома, яна вельмі саромеецца і пакутуе. Пакутуе ад сямейнай драмы і яе брат. «Дзеці вельмі здольныя, добра вучацца, — расказвае Вера Данілаўна. — І добрыя, хлопчык на другі ж дзень папрасіўся ў бальніцу праведаць маленькага брата».

Пры гэтых словах у старшыні райсавета Ганны Верамейчык так і пасыпаліся з вачэй слёзы.

— Ганна Аляксандраўна, не плакаць! — строга вымавіла дырэктар прытулку. — Мы тут наплакаліся асабліва ў першыя гады. А потым прыйшлі да высновы з горкім вопытам, што плакаць тут нельга. Трэба з усіх сілаў падтрымліваць у дзяцей веру, што ўсё ў рэшце рэшт наладзіцца. Як толькі заўважу гэтага хлопца самотнага ля акна, адразу адцягваю ўвагу, загаворваю пра нешта добрае, прапаную нейкую справу. Яны ж — дзеці, іх можна нечым захапіць. Яны не павінны несці 24 гадзіны ў суткі сваё гора як крыж. І многія бацькі, дзякуй Богу, адумваюцца, бяруць сябе ў рукі, вяртаем ім дзяцей. Для таго і працуем.

За тры гады праз прытулак прайшлі 134 непаўналетнія. 97 з іх вярнуліся дадому. Вера Кузьменка гаворыць, што некаторыя маці хоць знешне і выправіліся, але патрабуюць пастаяннага кантролю. Іншыя пакінулі былыя звычкі і лад жыцця назусім. Жанчын тых не пазнаць. Адна неяк зайшла да Веры Данілаўны, расказвала пра цяперашняе цвярозае жыццё, пра работу, поспехі дзяцей. Прамовіла, між іншым, са шкадаваннем: «Каб жа я зусім не піла, зараз у норкавым футры хадзіла б».

«Хачу дадому»

Намеснік дырэктара сацыяльна-педагагічнага цэнтра Валянціна Сяргейчык паказала пісьмы, якія пішуць маці на бацькоўскіх суботах ці іншых мерапрыемствах цэнтра. З лістоў вынікае, што далёка не ўсе хоць бы асэнсоўваюць сваю віну перад дзецьмі. Адна напісала: «Лічу, што будзе правільным, калі клопаты аб выхаванні маіх дзяцей возьме на сябе дзяржава». І ніякага шкадавання, ніякіх пакут сумлення. А яны ўсё роўна любяць сваіх мам і чакаюць. Усе разам работнікі цэнтра ўспаміналі па маёй просьбе выпадкі, калі дзеці не хацелі вяртацца дадому. Успомнілі толькі адзін. Там была маці-садыстка, яна здзекавалася з дзяўчынкі. Дзіця адправілі ў інтэрнат. Астатнія чакаюць і спадзяюцца.

Зараз у прытулку ёсць хлопчык, які жыў у доме побач. Амаль штодня ён ледзь не гадзінамі стаіць у калідоры харчовага блока, дзе акно выходзіць на дзверы яго пад'езда. Калі спыталі, чаго стаіць, дзіця адказала, што спадзяецца ўбачыць маму, якая заходзіць ці выходзіць з дома. Затое яна, расказвалі выхавальнікі, у бок прытулка і не глядзіць. Нават калі ідзе побач. Нават калі дзеці ў дварэ на прагулцы.

А мяне ўскалынуў яшчэ адзін хлопчык, вучань пачатковых класаў. Як толькі зайшла ў групу з фотаапаратам, ён старанна закрыўся часопісам, рабіў выгляд, што ўважліва чытае. І стала зразумела: баіцца трапіць у кадр, бо яму сорамна за маму. Захацелася адправіць гэтых мам... куды-неб

Беларускі фронт Высоцкага

Многія, хто слухаў песні Уладзіміра Высоцкага пра вайну, гатовыя былі лічыць, што ён сам ваяваў. Вайна сапраўды прайшла праз яго лёс — здарылася гэта ў Беларусі, як ні дзіўна, ужо ў мірны час. Уладзімір Высоцкі прадстаў у беларускім кіно ўпершыню менавіта ў ролі франтавіка, калі ў сярэдзіне 60-х выйшаў на экраны фільм Віктара Турава «Я родам з дзяцінства». Гэта была невялікая роля чалавека, які гарэў у танку і пасля вяртання знайшоў свой дом спаленым. Песню «На брацкіх магілах» Высоцкі назваў сваёй першай ваеннай песняй, але ў фільме яе выконвае Марк Бернэс. Спецыяльна па заказу Турава была напісана песня «Халады-халады», і яшчэ голас артыста гучыць у дзвюх песнях, якія ўвайшлі фрагментамі.

Высоцкі быў вельмі зацікаўлены ў здымках у Турава. Узрадавала і тое, што заключылі дамову на напісанне песень. Пра Высоцкага тады ўжо гаварылі, ён ужо быў папулярнай асобай. Тураў не ўпусціў магчымасць пазнаёміцца з артыстам асабіста. Гэтае знаёмства потым выльецца ў 16 гадоў сяброўскіх адносінаў. Хоць болей не будзе ніводнай ролі, дзе Высоцкі змог бы паказаць сябе як акцёр у фільмах Турава. Затое ён быў рады, калі была магчымасць прыехаць сюды і пісаць да фільмаў песні.

Ён хацеў паказаць каханай жанчыне Беларусь і імчаў сюды да Віктара Турава. Лес каля возера Свіцязь, песні ля вогнішча, мары, планы, новыя сустрэчы. Потым зноў прыезд на беларускую кінастудыю разам з Марынай Уладзі. Гэтага немагчыма было прапусціць і не заўважыць: жонка падарыла артысту серабрыстага шэрэ «Мерседэс», на якім ён з шыкам праехаў па мінскіх дарогах. Да таго часу артыст стаў ужо зоркай, кумірам, кожны крок якога выклікаў цікавасць. А ён ішоў па калідорах кінастудыі да рэжысёра, які яго разумеў і гатовы быў знайсці для яго працу, няхай і невялікую, але заўсёды прыкметную.

Да фільмаў Турава «Вайна пад стрэхамі» і «Сына ідуць у бой» паводле сцэнарыя Алеся Адамовіча, Высоцкі напісаў 7 песень. Але пасля выхаду фільма яны выконваліся голасам другога чалавека. Толькі праз некаторы час справядлівасць была адноўлена і песні загучалі ў выкананні аўтара, якога да таго ж можна пазнаць у эпізодзе. У хатнім архіве сям'і Адамовічаў ёсць аматарскі фільм з удзелам Высоцкага і Марыны Уладзі. **Дачка пісьменніка, Наталля Адамовіч успамінае:**

— Калі мой бацька выязджаў з кінагрупай у экспедыцыі, ён браў з сабой аматарскую камеру «Кварц». Дзякуючы гэтаму былі знятыя працоўныя моманты кінафільма «Сыны ідуць у бой». Здымкі адбываліся летам 1969 года пад Навагрудкам, дзе ў лесе быў спецыяльна пабудаваны партызанскі лагер. У жніўні таго ж года да здымачнай групы ў госці прыехалі Уладзімір Высоцкі і Марына Уладзі. Яны не былі ўдзельнікамі здымкаў, а прыехалі проста адпачыць на некалькі дзён па запрашэнні Турава ў адны з найпрыгажэйшых мясцін Гродзенскай вобласці. Высоцкі і Уладзі з вялікім задавальненнем пазіравалі перад аматарскай кінакамерай. Вось яны, абняўшыся, стаяць пад дрэва на фоне партызанскіх зямлянак, маладыя і шчаслівыя сваім каханнем. Ці разам з рэжысёрам, сцэнарыстам, аператарам, мастаком фільма і іншымі сядзяць на лаўцы і пра штосьці жыва размаўляюць. На жаль, татаў фільм нецыкі не захаваліся летам 1976-га (я была ўжо студэнткай) аднойчы вечарам тата сказаў мне: «Збірайся, пойдзем да Віктара Цімафеевіча Турава. Да яго ў госці прыехалі Уладзімір Высоцкі і Марына Уладзі. Пакажам ім той аматарскі фільм, які здымалі ў Навагрудку, і калі захочуць, падорым ім памяць аб Беларусі». Добра памятаю Высоцкага ў той вечар: ён быў апрануты ў джынсавы касцюм, што ў нас было вялікай рэдкасцю, і прычоска была непрывычная — доўгія прамыя валасы. Марына Уладзі была ў доўгай сукенцы з бавоўны. Яна выглядала злёгку распаўнеўшай, з-за чаго трошкі пяражывала. Павесілі экран, сталі глядзець наш фільм. Мяне ўразіла тое, што Валодзя і Марына падчас прагляду адчувалі сябе і размаўлялі так, як быццам яны знаходзяцца ў пакоі адны. Пазней была вячэра і, зразумела, Высоцкі спяваў свае вядомыя і новыя песні. А той фільм так і застаўся ў нашым архіве.

Віктар Тураў лічыцца адным з тых людзей, якія адкрылі Высоцкага для кіно. Дагэтуль ён здымаўся ў эпізодах. Але потым і на «Беларусьфільме» ад яго працы таксама сталі заставацца эпізоды — чыноўнікі сачылі за тым, каб скараціць шлях няўгоднага артыста да гледача, скараціць нават яго самога, дзе гэта толькі магчыма...

Так здарылася ў фільме Віталя Чацверыкова «Саша-Сашанька», дзе Уладзімір Высоцкі не толькі здымаўся, але спяваў свае ж песні. Рэжысёр, ведаючы стаўленне да артыста, яго максімальна «замаскіраваў» — перафарбаваліся валасы, голас загучаў непрывычна (проста таму, што агучваў зусім іншы акцёр). Але на выхадзе ўсё атрымалася зусім не так, як чакалася: тры эпізоды з яго ўдзелам, дзве яго песні (і толькі адну з іх ён спявае сам). А ў цітрах... Увогуле такога чалавека няма. Прозвішча знікла, нібыта ён не здымаўся, не ўдзельнічаў, не спяваў. І быццам бы ніхто ў гэтым не вінаваты. Рабіла сваю справу рэпутацыя Высоцкага — маўляў, чалавек не надзейны. Не наш.

Беларускія рэжысёры гатовыя былі ісці на супрацоўніцтва са славутым маскоўскім артыстам, нягледзячы на адносіны да яго чыноўнікаў. Абаяльнасць, энергія, вобразнасць і моц яго песень брала ў палон. Ён нібыта адчуваў беларускі боль, калі пісаў песні пра вайну. І гэта быў той аргумент, з якім, здавалася, цяжка спрачацца. Але ўсё роўна спрэчкі былі. З імі давялося сутыкнуцца яшчэ аднаму майстру беларускага кіно рэжысёру **Ігару ДАБРАЛЮБАВУ**, які каментаваў нашай газеце адзін эпізод са свайго фільма: *«Для фільма «Іван Макаравіч» патрэбна была песня, якую б спяваў герой, хлопчык, які на паўстанку просіць малако. Высоцкі напісаў цудоўную песню. Імгненна зразумеў задуму. Ён быў просты і вельмі дзелавы чалавек, гэта цяпер яго імя акружана міфамі. Калі падышоў тэрмін, даслаў касету з запісам. Але ў Маскве песню вырашылі выкінуць — тады ўсё вырашалася ў «Дзяржкіно». Фільм прынялі, за выключэннем аднаго эпізоду, дзе гучала песня. Патлумачылі так: нядобра, калі хлопчык разбівае з рагаткі трохлітровую бутэльку малака. А больш песня нідзе не гучала...»*

Больш за дзесятак песень стварыў Уладзімір Высоцкі для беларускіх фільмаў. Апошнія прагучалі ў фільме Турава «Кропка адліку». Але там іх выконвае Марына Уладзі: фільм выйшаў на экран ужо пасля смерці артыста...

Ларыса ЦІМОШЫК.

59 ГАДОЎ НА 12

У Ганцавічах суд вынес прыгавор 12 работнікам спажывецкага таварыства раёна. «Звязда» пра гэты працэс пісала («Маё і наша», 24.01. 2008 г.)

Абвінавачваным не дапамаглі і 11 адвакатаў, якія іх абаранялі. Чатыры чалавекі атрымалі па 7 гадоў пазбаўлення волі, адзін — 6 гадоў, пяць — па 5 гадоў, а дваіх «пашкадавалі» — ім выпала абмежаванне волі. Найбольшыя тэрміны атрымалі бухгалтары райпо. Усе асуджаныя — жанчыны.

300 ШЫН...

Калі супрацоўнікі міліцыі зазірнулі ў адзін з гаражоў па вул. Прафесійнай у Баранавічах, то ўбачылі там амаль трыста аўтамабільных шын.

Прадпрымальнік не здолеў прад'явіць на тавар ніякіх дакументаў. Шыны на суму больш як 29 млн рублёў канфіскаваны, а іх гаспадара чакае яшчэ і штраф.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ДАПАМОГА ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМ У РЭЖЫМЕ ON-LINE

Цяпер тлумачэнні па пытаннях падаткаабкладання прыватных унітарных прадпрыемстваў, якія былі створаны ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28.06.2007 года № 302, падаткаплацельшчыкі Мінскай вобласці змогуць атрымаць штодзённа ў працоўныя дні з 8.00 да 20.00 па тэлефоне «гарачай лініі»: (8 017) 331 27 32; 331 27 72; 331 17 60.

СКАНВОРД

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



Кустоўнік з чорнымі лекавымі ягадамі

«Клуб па інтарэсах» каля хаты
Хвастатая лічынка жабкі
Выканаўца роляў у спектаклі
Вандроўны маг, фокуснік
Квадратны выраз каўняра сукенкі
Водгулле, адгалосак
Плывучая землечарпальная машына
Стан паглыблення ва ўласныя думкі
Пралёт лесвіцы ў доме
Паэма Яўгена Баратынскага
Буйны порт у Галандыі
Інструмент для свідравання
Вершаванае 8-радкоўе
Бярвенне для сплаву па рацэ
Насельнік, абарыген Паўночнай Афрыкі
Прасторны пакой ў кватэры
Рэкламны ролік на тэлебачанні
Мясная страва з агародніны
Снарад цяжкаатлета
Хваравіты стан з гарачкай і трасцай
Калючае пустазелле
Мыс ля праліва Па-дэ-Кале
Каталіцкі манастыр
Горад-герой у Расійскай Федэрацыі
Лесвіца на карабелі, самалёце
Праём у сцяне для святла, паветра
Чуткі, размовы, няпэўныя звесткі
Магніты сплаў Fe+Ni
Лопасць у рухавіку парахода
Музычны інструмент нізкага рэгістра
Пацеркі з каштоўных камянёў
Невялікая пабудова для вахцёра, паставога
Адм.-тэр. адзінка (акруга) ў Даніі
Пярэдняя частка галавы чалавека
Прылада для дыхання пад вадой
Другая сістэма мезазоя
Астравы на поўдні Ціхага акіяна
Злосная «ўсмешка» звера
Шатландскі экіпаж, філосаф XVIII ст.
Пакаёвая лекавая расліна
Устарэлая назва стандарту
Самая буйная артэрыя
Прыток ракі Вілія
Сухі гарачы вецер Міжземнамор'я

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (24 студзеня). <u>Па гарызанталі:</u> Ярд. «Ферары». «Хонда». Літ. Ронда. Рагу. Сан. Гута. Расін. Сага. Атака. Урал. Гак. Друз. Кашара. «Ака». Гара. Стрэл. База. Фата. Апарат. Паркан. Нара. Міна. Тара. Прыпас. Джып. Латы. Сілас. Рота. Статак. **<u>Па вертыкалі:</u>** Рэха. Рагалік. Грукат. Нуга. Зарапад. Сход. Аўт. Іртыш. «Рэно». Кап. Твар. Ліра. Палас. Цукар. Намалот. Ігар. Тата. Фартуна. Акула. Прысак. Сала. Біт. Шабаны. Нага. Арап. Кар. Зара. Рака. «Атас».

Предложение о покупке акций ОАО «Брандко»
УСЛОВИЯ ПРЕДЛОЖЕНИЯ:
Покупатель — Открытое акционерное общество «Брандко», РБ, г. Минск, ул. Центральная, 46.
Эмитент акций — ОАО «Брандко» в ЕГР № 800002642.
Количество акций к приобретению — 68 штук.
Цена приобретения — 441 890 белорусских рублей за одну акцию (цена приобретения является обязательной для всех предложенных к приобретению акций). **Срок приема предложений от акционеров с 25.01 по 30.01.2008.**
УНП 800002642

Забытае? Новае? Вечнае!

«Мышкі» на караваі — дзеці ў хаце

Апошнім часам мы атрымалі шмат пытанняў, якія датычацца розных аспектаў святкавання вяселля. На жаль, вашы лісты сведчаць пра тое, што няведанне традыцый прыводзіць да ўсялякіх непаразуменняў, якія ў сваю чаргу ўплываюць на лёс людзей. Надзея Адамаўна з Любанскага раёна піша: «Было вяселле сына. Пасля таго як падзялілі каравай, я не прыбрала вяршок, якім адарылі маладых. Назаўтра да нас завітала суседка, убачыла гэты вяршок ... і з'ела яго. У сына майго жыццё не склалася, маладыя разышліся. А ў суседкі сын праз год жаніўся. Ці можна тут нешта паправіць?»

Дзіўна чуць такія словы ад матулі — вопытнага і спрактыкаванага чалавека, які дажыў да шчаслівага дня — вяселля свайго дзіцяці, а што рабіць з асноўнымі атрыбутамі гэтай неардынарнай падзеі — не ведае. Колькі часу яшчэ мы будзем заставацца такімі: спачатку зробім не так, як трэба, а затым шукаем паратунку? Няхай бы ўсё было наадварот: перш чым ладзіць вяселле, распытай у людзей — што і як.

Мы ўжо неаднаразова звярталі ўвагу на тое, што ў традыцыйнай культуры беларусаў і іншых славянскіх народаў вялікая ўвага надаецца сімволіцы першага — усяму таму, што распачынае тое ці іншае абрадавае дзеянне, або таму, з чаго пачынаецца адказны этап у жыцці чалавека, сям'і, гаспадарчай дзейнасці ўсёй вясковай абшчыны. Напрыклад, вялікае значэнне мела веснавая сяўба: лічылася, што **ўраджай усіх вяскоўцаў будзе залежаць ад таго, хто з гаспадароў першым выканае засеўкі.** Асабліва значэнне надавалася першаму выгану хатняй жывёлы ў поле, а таксама таму месцу, адкуль трэба пачынаць садзіць грады.

Адпаведна з гэтым правілам выконваліся шматлікія абрадавыя дзеянні падчас традыцыйнага вяселля і перш-наперш каравайнага абрада. Цеста для каравая замешвалі толькі самыя блізкія людзі, часцей за ўсё — хросная маці. Ні ў якім разе да гэтага рытуалу не дапускаліся ўдовы і жанчыны, якія скасавалі шлюб, каб праз энергетыку галоўных удзельнікаў не перадаць нешчаслівы лёс жаніху і нявесце.

У структуры трох'яруснага каравая «вяршок» сімвалізаваў навастворануюсямейную пару, таму ў розных мясцінах Беларусі верхні гарызонт рытуальнага хлеба аздабляўся рознымі сімвалічнымі выявамі, фігурамі, кветкамі, выраблянымі з таго ж цеста і расфарбаванымі. Уласна кажучы, кожная з выяў мела сакральна-магічны сэнс, у якім паўтараліся ўсе тыя вясельныя пажаданні маладым, якія гучалі ў той час, калі сваты дзялілі каравай паміж прадстаўнікамі роду жаніха або нявесты. Напрыклад, у адным з пажаданняў гучаў наказ быць працавітымі, завесці заможную гаспадарку, шанаваць бацькоў, шанаваць Бога:

Дарую я сваім маладым,
не сваім да Божым,
чырвонага золата,
цёлку, аўцу і свінню.
Да на ета пушчай
не спагадаюць,
а рана ўстаюць,
атца і маць паважаюць,
то і Бог паможа!

Гэта пажаданне было закадзіравана ў наступным «арнаментальным тэксце», які быў нанесены на каравай: дзве дугі-аркі, перакрыжаваныя паміж сабой, і праваслаўны або каталіцкі святар, які заручае маладых.

Сярод іншых пажаданняў былі і такія, якія самым непасрэдным чынам указвалі на необходнасць прадаўжэння роду:

Дару вам рубель,
Каб купілі карабель,
Каб дзень цалаваліся,
А ноч кахаліся.
* * *
Каб ваш ложак рыпаў, рыпаў,
А да году сынок выпаў.

У якасці прадметаў-сімвалаў, якія замацоўвалі пажаданні эратычнага характару, выступалі выявы птушак або зайцоў, шышак (фізічная моц жаніха), а таксама ягады клубніц, якімі каравай абткалі па крузе — дванаццаць штук. Паяданне маладымі гэтых сімвалічных атрыбутаў было скіравана на тое, калектыўная энергія тых, хто выпякаў каравай, і тых, хто прымаў удзел у яго дзяльбе, аб'ядналася і максімальна паспрыяла зачацыю і нараджэнню першанца.

У гэтым месцы хацелася б заўважыць, што нашы разважанні абапіраюцца на цэлы шэраг аналагічных сітуацый з розных традыцыйных абрадаў нашага народа, у тым ліку на практыку вядзення гаспадаркі і асабліва на чарадзейныя казкі.

Так, **для таго каб маладая хутка зацяжарала, яе садзілі на грошы, якімі яе адарылі госці, або на дзяжу. А вось каб улетку агуркі далі добры ўраджай, то адразу ж і цалаваліся цераз граду (многія інфарматары пры гэтым заўважаюць, што яны — гаспадары — пры гэтым павінны быць без штаноў!)**

Нам неаднаразова даводзілася запісваць розныя варыянты казак, у якіх ключавым з'яўляецца наступны матыў:

«Два браты перараздзяюць цераз возера. Там рыбаловы ловяць рыбу і выцягнулі адну толькі рыбіну. Так адзін увідзеў гэту рыбіну і атвячаець:

— Вот рыбіна дарагая. Хто яе будзець есць, тэй сына родзіць, і хто косці абаесць, тэй сына родзіць, а хто косці паесць, і тэй сына родзіць. Будуць тры сыны і ўсе багатыры.

Дасталось тыя рыбка царэўне. Зжарыла яе і з'ела. Костачкі на блюдзечка адлажыла. Прыйшла яе дачка і давай абсасваць косці гэтыя і брасаць іх пад стол. А сучэнка, быўшы пад сталом, косці гэтыя і паела. Удруг яны ўсе ўтрох і забярэменелі. Сколькі ўрэмя прайшло, радзілі ўсе тры па сыну — царыца, і доч яе, і сучэнка гэта».

Усе, хто меў дачыненне да рыбы, атрымалі шчасце нарадзіць багатыроў. Тое ж самае датычылася гаспадароў і гасцей вясельнага застолля. Верхні ярус каравая — маладыя, сярэдні — іх бацькі. Тады скажыце, калі ласка, як можна было пакінуць без нагляду «вяршок» каравая, які, уласна кажучы, утрымліваў у сабе патэнцыю (дзетародную здольнасць) толькі што заручанай пары?

Звычайна частку гэтага вяршка аддавалі з'ядаць маладым, каб перадаць здольнасць зачаць першае дзіця, а астатнюю долю зашывалі ў асобную падушку і клалі паміж маладымі, каб яны здольныя былі нарадзіць і наступных дзетак.

У тым выпадку, пра які мы ўзгадалі на самым пачатку, «вяршок» з'ела суседка, але нам думаецца, што на самай справе ўсё было трошкі не так, як пра гэта паведаміла наша чытачка.

Хутчэй за ўсё госця з'ела не ўсё, частку каравая яна наўмысна прыхапіла з сабой і аддала з'есці (маўляў, пакаштуйце гасцінца) свайму сыну, які праз год жаніўся і меў шчасце стаць бацькам. А тыя, каму сапраўды быў адрасаваны кавалак каравая, ды так і не трапіў у рукі, доўга не пражылі разам, скасавалі шлюб.

Ці можна нешта паправіць у гэтым выпадку? Хутчэй за ўсё, не. Маці можа пайсці тым жа шляхам — украсці кавалак чужога каравая і аддаць свайму сыну. Аднак у такім разе ланцуг няшчасцяў можа аказацца бясконцым...

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.
Кантактны тэлефон: 292 21 03.

Чаму я чытаю «Звязду»

«Дзед, куды газету прыхаваў?!»

Уладзімір Вячаслававіч Кунцэвіч, пенсіянер, г. Мінск, выпісвае «Звязду» з 1965 года:

— Газету я пачаў выпісваць фактычна адразу, як пераехаў з вёскі ў горад. Працаваў на Мінскім трактарным заводзе (перад выхадам на пенсію — начальнікам змены), дык калі ўжо быў майстрам, браў удзел у абавязковай падпісцы на перыядычныя выданні. «Праўду» тады трэба было выпісваць абавязкова, а што да рэспубліканскіх газет — быў выбар. Я спыніўся на «Звяздзе», пра што дагэтуль не шкадую, не разлучаюся з газетай. Чаму? Яна на роднай мове, а я не хачу губляць родных каранёў.

Я шмат часу да сталічнага жыцця пражыў у вёсцы, таму мне вельмі блізкія і зразумелыя матэрыялы на гэтую тэму, што выходзяць у рубрыках Валянціны Доўнар *(смяецца)*. Вельмі паважаю і бяру шмат карыснага з рубрыкі «Крынічка» — пра сад і агарод. Я ж у горадзе толькі зімой жыву, а ў цёплую пару — у вёску, да сваіх 20 сотак; у мяне ж і трактар свой ёсць! *(Смяецца.)* Дарэчы, побач гаспадары яшчэ недзе трох сядзібаў выпісваюць «Звязду», у вольную хвіліну можам коратка абмеркаваць нейкі артыкул з газеты.

А ўвогуле чытаю ўсё, што друкуеце, пададаецца ў вас разумная прапорцыя ў падачы матэрыялаў на розныя тэмы і густ. У маёй сям'і, — а гэта жонка, малодшая дачка з зяцем і ўнукам, — усе цікавяцца «Звяздой». Я іншым часам першым перахаплю яе, убачу нейкі цікавы артыкул, дый прыхаваю газету, каб потым першаму спакойна яе пачытаць. Дык хатнія *(смяецца)* адразу да мяне: «Дзед, куды газету прыхаваў?!»

Соладка! А магло быць — горка-горка...

У вёсках ля калодзежаў, у гарадах ля калонак абмяркоўвалася некалі ўсё — ад глабальных падзей, кшталту палёту ў космас, да чыста сямейных: што ў каго на абед. Само сабой — вяліся размовы пра навіны: хрысціны, радзіны, вяселлі...

У той раз (справа была ў хуткасці пасля вайны) — ва ўсю абмяркоўвалі Валерава.

— Па-людску, па-людску гулялі, — казалі жанчыны. — Гарманіст граў хораша. І не напіўся.

— Закускі з выпіўкай хапала.

— Бойкі не было.

— Але ж, бабачкі, ахвяры маглі быць, маглі, — свае пяць капеек уткнула ў размову цётка Маруся. — Малады ж, помніце, як хапіў, як кідануў у дзвер тую бонбу... Добра, што ні ў кога не папаў, а то далібог пакалечыў бы!..

Справа «з бонбай» выглядала так. Да вяселля яшчэ, загадзя, жаніх накупляў цукерак, так званых «падушачак». Загарнуў іх у дадатковы папяровы кулёк і паклаў на комін — ведаў, што спатрэбяцца.

І вось паселі госці за стол, па чарцы-другой падняслі. Прызналі, што гарэлка горкая... Сталі крычаць. Малады тады ліха так: «А я падсаладжу» (гэта ж цяпер адразу цалуюцца... А ўперад іначай было.) Па дамове міргнуў ён старэйшай сястры, тая кулёк яму падала. Жаніх узяў і кінуў: думаў цукеркі па сталах рассыплюцца, а яны (на коміне ж цёпла было) падагрэліся, зліпліся. І таму каменем у дзверы бу-бух... Бабы аж ахнулі: «Бонба»!..

Як яе «абясшкодзіць» першымі дапялі малыя: схапілі, сталі «разбіраць». Вясельнікі ж, убачыўшы, што ўсё абышлося, узаралися смехам ды чарговым: «Горка!».

Маладому нічога не заставалася (цукеркі кінуў усе), як пачаць цалаванца.

...Ну, вельмі соладка было! Бо, дзякаваць Богу, усё абышлося.

В.Д. КАБАЧЭЎСКІ,
г. Орша.

Пра што не пісалі газеты

Здарылася гэта ў адной вёсцы, у адной вялікай сям'і. Роданачальніца яе 100 гадоў пражыла. Прычым не неяк там — абы як, а хораша, годна. Ды і цяпер за любую работу хапалася, па хаце тупала, а пры выпадку, на бяседзе якой, яшчэ і кульнуць магла — хоць трэць чарачкі.

Зрэшты, пра гэта — газеты тады пісалі. І чыстую праўду... Але ж не ўсю.

Дык вось. З нагоды стагоддзя рашыла яе сямейства і бабулі і сабе вялікае свята зрабіць — разам, за адным сталом сабрацца.

Як рашылі яны так і зрабілі: з'ехаліся сыны, нявесткі, дочкі, зяці, унукі, праўнукі, нават прапраўнукі. Павіншавалі імянінніцу, паселі за стол. Ёй жа і першае слова далі. Устала роданачальніца, узяла тую чарыцу, кажа:

— Дзеткі мае, каб вы ведалі, як жа я рада, што вы ўсе да мяне прыехалі, што я ўсіх вас убачыла... І вы — адзін аднаго на сваёй радзімцы... Гэта ж такое свята, такое шчасце! То дай нам Бог і налета прычакаць!

На гэтым усе пачалі ўставаць, з чаркамі да бабулінай цягнуцца — ну каб чокнуцца. А нявестка, якая разам з ёю век свой зжыла, як усхопіцца... Кажа:

— Як? Ты столькі пражыла і праз год яшчэ «прычакаці»?.. Не!.. Вы як сабе хочаце, а я за гэты тост піць не буду!

Чарку аб стол і ходу.

...Такім чынам — свята было азмрочана, але ж не сапсавана. Бо бабка і без нявесткі знала, што жылася ўжо — на гэтым свеце.

Але ж і на той, казала, трэба каб Бог забраў, а не чэрці занеслі.

А.А. ЗЕЛЯНКЕВІЧ,
в. Мачуль, Столінскі раён.

Справа не ў парсюку?

За савецкім часам народнага багацця было шмат і «ўсё вакол калгаснае, усё вакол маё». Вось і «адразалі» ад яго хто колькі мог. У прыватнасці, адзін старшыня збіраўся абараняць кандыдацкую дысертацыю. Каб «працэс» гэты лягчэй прайшоў, хацеў падстрахавацца, задобрыць рэцэнзентаў рознымі дарункамі — найчасцей свежай свінінкай. У той раз, прынамсі, досыць ладнага парсючка закалолі, разабралі, загрузілі ў багажнік. Вадзіцелю (якраз ён мне гэта і расказваў. — **Аўт.**) «гасцінец» даручылі завезці, адрас далі.

Прыехаў ён, значыцца, у Мінск, знайшоў патрэбны дом, кватэру, звоніць, — ніхто не адчыняе. Пакруціўся, пачакаў з гадзіну, яшчэ раз пазваніў — глуха.

Вярнуўся дамоў, балазе недалёка... Назаўтра раніцай зноў прыязджае. І зноў яму не адчыняе ніхто.

А дома ж сям'я, дзеці, грошай няма, халадзільнік пусты... Вось ён і... Раз старшыні можна... Тым больш, што ён пра парсюка таго нічога і не пытаецца...

Што цікава, дысертацыя тая абаранілася. І досыць паспяхова. Таму старшынёўскі вадзіцель дагэтуль гадае, ці то сапраўды работа была вартая? Ці то парсюк той быў не першы і не апошні?

Сцяпан БУКАЦІЧ,
г. Смалявічы.

І ніякай хіміі!

Якіх толькі лекаў цяпер няма, якіх толькі лекараў — вушы падстаўляй ды слухай... Але ж, наслухаўшыся, і ўліпнуць можна. Як мая знаёмая...

Яна, значыцца, пра ёгу начыталася. І вельмі ж уражана была: гэта ж ніякай хіміі табе, ніякіх аптэк за тры вярсты, ніякіх затрат... Адна карысць толькі. Трэба, думае, паспрабаваць. І нават адкладваць гэта не стала: прачынаецца назаўтра раніцай — галава баліць, аж раскалваецца. І сэрца ные. У іншы дзень яна па таблетку палезла б. А тут рашыла ёгай палячыцца. Адкрыла ў кніжцы патрэбную старонку, знайшла позу ад галаўнога болю і ў яе, у гэту позу, стала ногі свае складаць. Але ж ведама 70 з хвастом — косці старыя, не гнуцца, не пераплятаюцца... Ну хоць ты плач. Расстроілася кабета — яшчэ горш галава ёй стала балець.

Але ж дай, думае, хоць сэрца тады ёгай палячу — поза там, як быццам прымальная: прысесці на пяты, максімальна сагнуцца, максімальна разявіць рот і зноў жа максімальна вываліць язык...

Прымасцілася. Сагнулася... Разявілася. Язык (а ён у яе доўгі, як памяло) аж да падлогі звесіла... Вочы заплюшчыла. Сядзіць. Медытуе...

Як на тое ліха, суседку прынесла. Каб індзіянку якую, альбо японку, яны б, мо, не здзівіліся, яны б здагадаліся, што чалавек ёгай сэрца лечыць. А наша дурніца ў гвалт. Ды на вуліцу... Людзей склікаць.

Раўсці раве, але ж «Стой!» за спінай усё-такі чуе.

Стала, струпянела... Потым памаленьку павярнулася... На той голас. Шэпча:

— Суседачка... Я ж думала ты ўжо... Таго... Усё, захлупілася, падавілася нечым...

— Ды не... Гэта я так лячуся. Ёгай... Магу і цябе навучыць. Толькі не кажы нікому. Не скажаш?

— Не, — кажа тая, — я ж разумею.

Але пры гэтым выгляд у яе быў... Ну, быццам яна і наогул ужо нічога не цяміць.

Дамоў пасунулася.

А эксперымантатарцы ад гэтага так смешна стала, так смешна, — з паўгадзіны рагатала, аж заходзілася. А потым прыслухалася да сябе і... цуд: нічога не баліць — ні сэрца, ні галава, ні ногі, ні рукі...

А ўсё чаму? Добры, здаровы смех — гэта наша лякарства!

С.Л., *Рагачоўскі раён.*

Не чапай!

На знаёмым лецішчы сліва расла. Была яна невысокая, стройная, пладаносная. Але ж гаспадар якраз пад гэтым дрэўцам машыну прыладзіўся ставіць, а таму вельмі не любіў, што з дрэўца на любімае аўто то лісця наваліцца, то сліў саспелых...

Карацей, рашыў ён «ворага» звесці. Узяў рыдлёўку, пілу, сякеру... Спілаваў, паабсякаў вецце...

Карнявішча засталося. Абкапаў ён пянёк той з усіх бакоў, палку падсунуў, з усёй сілы паціснуў і...

Спружыніла тая: як падкіне «капальніка» ўгору, а потым як чмякне аб зямлю. Аж дых заняло.

...Вось так адпомсціла прыгажуня-сліўка за тое, што звялі яе з белага свету.

Сяргей ЧЫЛІКІН-САДЭЛЬСКІ,
г. Мінск.

Не там стаў... Не там лёг...

У мінулым ужо стагоддзі гасцявала я неяк раз у сваіх знаёмых на Віцебшчыне. Удала-няўдала прыехала, сказаць не магу, бо якраз на гэты вечар у калгасе справаздачны сход планаваўся. Гаспадарам трэба было ісці. А мне тады што рабіць? Вось, каб дома адна не сядзела, яны мяне і паклікалі, з сабой узялі. Па дарозе яшчэ расказалі, што былы іх старшыня быў, мякка кажучы, да людзей хамаваты, самадурысты, да таго ж — махляваў, займаўся прыпіскамі, каб перад начальствам лепей выглядаць, халуям ды падхалімам розным плацію больш... Але і паплаціўся — скінулі яго з пасады, новага прызначылі. Толькі год кіруе. Малады...

І вось прыходзім мы ў клуб. Людзей там — паўнютка.

Як водзіцца, малады той з дакладам спярша выступае, хвалюецца. Кажа, што ўдалося зрабіць, што не...

Потым іншыя гаварыць нешта сталі. У асноўным добрае пра старшыню, пра гэты год...

Мужчына адзін на трыбуну ўсё рваўся. З радавых, відаць. Далі слова і яму. Таксама хваліў старшыню. Напрыканцы сказаў, што вось гэты, хоць і малады — чалавек харошы, і прафесіянал... На сваім месцы... А вось папярэдні — ледзь не да ручкі гаспадарку давёў.

І далей (даслоўна): «З тым старшынёй мы, можна сказаць, на краю бездані ўжо стаялі. З гэтым — крок наперад зрабілі».

Па зале прайшоў смяшок.

А сапраўдны смех выклікала другое выступленне. У дакладзе шмат папрокаў было ў адрас галоўнага заатэхніка — надоі нізкія, прывагі малыя, на фермах парадку няма... Заатэхнік апраўдваўся як мог, называў розныя прычыны. А закончыў «прамову» так: «Я ўжо і не знаю, як далей працаваць. Ну ўвесь аддаюся рабоце. З даяркамі (гэта значыць, позна) лажуся, з даяркамі ўстаю, а толку — аніякага!

...А ўсё чаму? Мо, насамрэч, не там стаім? Ці не там кладзёмся?

В.К., *Карэліцкі раён.*

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.
Ад яе ж заўсёднае — пішыце!

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Блізняты павінны быць рашучымі, а Рыбам час пазбавіцца ад шкоднай звычкі

ВАЕН. Тыдзень створыць усе неабходныя ўмовы для новага этапа духоўнага пераражэння, пераасэнсавання сваіх дасягненняў і вызначэння слабых месцаў. Варта прыслухацца да парад навакольных — яны вам дапамогуць. У адносінах з партнёрамі можа ўзнікнуць некаторая напружанасць. У аўторак з'явіцца шанц выбраць правільны накірунак і сабрацца з сіламі для новага рыўка. У пятніцу будзьце больш асцярожнымі ў зносінах з незнаёмымі людзьмі.

ЦЯЛЕЦ. Вы маглі пабудаваць вельмі грандыёзныя планы. Магчыма, лепш іх скараціць да рэальнага аб'ёму? Верагодныя канфлікты ў каманднай дзейнасці адцягнуць увагу ад праблем. Зносіны з начальствам па магчымасці скараціце да мінімуму, інакш вашы не ў меру дасціпныя выказванні могуць справакаваць канфліктную сітуацыю. У пятніцу могуць з'явіцца нечаканыя госці. У суботу прыслухайцеся да парад родных.

БЛІЗНЯТЫ. Давядзецца прадэманстраваць вынаходлівасць і смеласць. Дзейнічайце рашуча — і перад вамі адкрыюцца новыя далягляды. Амбіцыі могуць спрыяць умацаванню фінансавага становішча. Аднак у сярэдзіне тыдня магчымыя непрадбачаныя цяжкасці, для пераадольвання якіх неабходна прыкласці значныя намаганні. У аўторак варта перагледзець мэты і задачы, вырашэнне якіх запланавалі на бліжэйшую будучыню.

РАК. Рашэнні, ад якіх залежыць ваша будучыня, прымайце самастойна, не прыслухоўвайцеся да парад навакольных, бо сітуацыя нестандартная. Крыху знізьце аб'ём і тэмп работы — вам неабходны кароткачасовы адпачынак. Паўдзельнічайце ў распрацоўцы новага праекта: у ходзе работы даведаецеся многа цікавага і карыснага для сябе. Старайцеся пазбягаць непатрэбных кантактаў. Пакіньце крыху вольнага часу для сябе.

ЛЕЎ. Калі вы ў нядаўнім мінулым траплялі ў лапы да ляноты, то адказваць за недапрацоўкі не давядзецца. Нагрузка на рабоце будзе паступова нарастаць. Толькі не ўзвальвайце на сябе ўсё — выбірайце аб'ём работы па сілах. Пастарайцеся выкраіць крыху часу для сябе: займіцеся самаразвіццём і самаўдасканальваннем. Прызнайце свае памылкі, а выправіўшы, рухайцеся далей.

ДЗЕВА. Вам проста неабходна захоўваць унутраны спакой і сканцэнтравацца на самай важнай задачы: толькі так можна выйграць у няпростых сітуацыях, якія чакаюць на гэтым тыдні. У панядзелак магчы

Запрашальнік

Першае «Люблю» Марыны Васілеўскай

У творчым жыцці кожнага артыста ёсць своеасаблівыя «вузельчыкі на памяць» — кропкі адліку, пасля якіх пройдзена чарговая прыступка. Першы выхад на сцэну, першая перамога на прэстыжным конкурсе, першы альбом або кліп… Вось і ў салісткі Белдзяржфілармоніі, спявачкі Марыны Васілеўскай 30 студзеня пройдзе чарговы творчы экзамен — першы сольны канцэрт.

І хоць за плячыма ў спявачкі ўжо ёсць перамога ў Нацыянальным тэлевізійным конкурсе маладых выканаўцаў «Фэст», а таксама спецыяльная прэмія імя Ул. Мулявіна на фестывалі мастацтваў «Славянскі базар», Марына рыхтуецца да выступлення вельмі адказна і хвалюецца — настолькі, што часам… забываецца паесці.

— Калі артыст не будзе ставіць перад сабой пэўныя мэты, то ён не будзе развівацца. Я таксама паставіла перад сабой мэту: зрабіць сольны канцэрт. Палічыла, што ўжо гатовая да гэтага, час прыйшоў, і паступова пачала рыхтавацца, — расказвае Марына ў перапынку паміж запісам у студыі і рэпетыцыямі на сцэне. — Тым больш што якраз пасля «Славянскага базару ў Віцебску» мяне запрасілі працаваць у цудоўны калектыў — Нацыянальны акадэмічны аркестр імя І. Жыновіча пад мастацкім кіраўніцтвам Міхаіла Казінца. Мы ўжо два гады супрацоўнічаем, робім новыя песні, а ўсе мае эстрадныя песні пакладзеныя для выканання з аркестрам — такога раней ніколі не было. З гэтай праграмай мы аб'ездзілі практычна ўсю Беларусь, былі нават у Казахстане на Днях культуры Беларусі… І мне надзвычай прыемна працаваць з гэтымі людзьмі, сярод якіх большасць — народныя і заслужаныя артысты, здольныя выконваць абсалютна любую музыку, ад народнай да класічнай, ад эстрады да джазу.

Назваць праграму Марына вырашыла «Люблю» — усё ж менавіта гэтая песня Валерыя Іванова прынесла дзяўчыне перамогу на тэлеконкурсе «Фэст», а разам з тым і пуцёўку на «Славянскі базар». Астатнія песні, каля 20, падбіраліся выходзячы з таго ж прынцыпу — тое, што тычыцца пачуцця любові — не толькі да чалавека, але і да роднай зямлі; тое, што любіць выконваць сама спявачка, і тое, што найбольш падабаецца публіцы. Такая агульная музычная любоў атрымаецца. Нават у двух аддзяленнях.

У першым спявачка будзе спяваць у суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага аркестра Беларусі імя Іосіфа Жыновіча. Тут прагучаць эстрадныя песні, а таксама рэтра — хіты мінулых гадоў, якія заўжды вельмі запатрабаваныя ў слухачоў: «Адліга» (пасля выканання гэтай песні на рэспубліканскім патрыятычным конкурсе «Песні нашых бацькоў» спявачка была запрошаная ў Мінск, адразу на трэці курс Універсітэта культуры, які, між іншым, скончыла з адзнакай — **Аўт.**), «Якім ты быў», «Забудзь зваротную дарогу», абноўленая версія «Што ты робіш са мною», «Пажар кахання», «Ваеннае танга» і г.д. Гэтаксама слухачоў чакае прэм'ерны дуэт з Якавам Навуменкам — першая ў жыцці Марыны Васілеўскай спроба, дагэтуль дзяўчына выступала толькі ў якасці салісткі.

Што тычыцца другога аддзялення, у ім артыстка выйдзе зусім у іншым вобразе і з іншым рэпертуарам — разам з вядомым гуртом «Apple Tea» яна выканае джазавыя шлягеры са скарбонкі сусветнай класікі, і ўвогуле папулярныя песні на англійскай мове, сярод якіх некалькі прэм'ер (у прыватнасці, адна з іх — з вакальнай групай «Камерата», таксама «прыпісанай» да філармоніі). «Дарэчы, цалкам магчыма, што неўзабаве нават выйдзе дыск англамоўных песень, але дакладна аб тэрмінах і змесце я пакуль не загадваю», — прызнаецца Марына. Затое дзеля таго, каб песні прагучалі бездакорна, яна спецыяльна некалькі разоў на тыдзень наведвае курсы англійскай мовы: «Зараз, калі я чую англамоўныя песні некаторых беларускіх выканаўцаў, то разумею, чаму спецыялісты жахаюцца — гэта ж натуральна рэжа слых. Так што буду працаваць над сабой, каб не папоўніць шэрагі «недавучак», — смяецца Марына.

— Неяк небагата ў цябе гасцей, — «падкалолі» мы Марыну.

— А гэта зроблена наўмысна, — — не разгубілася спявачка. — Бывае ж — чытаеш на афішы: «сольная праграма артыста N.», прыходзіш на канцэрт, а там дзве трэці праграмы выконваюць госці і сябры. У мяне ўсё запланавана інакш, я практычна пастаянна буду знаходзіцца на сцэне і кантактаваць са слухачамі, у рэшце рэшт, гэта ж, можна сказаць, мой бенефіс.

Затое будуць на канцэрце асобныя ганаровыя госці — і не толькі калегі з філармоніі і чыноўнікі з Міністэрства культуры, але найперш бацькі і сваякі Марыны Васілеўскай. Калі дазволіць здароўе, прыедзе з Магілёва нават любімая бабуля, якой больш за 80 гадоў. А як інакш, «сольнік» — гэта заўжды падзея, які б вялікі вопыт і творчы багаж не меў артыст.

— У праграме два аддзяленні, розныя па настрої і стылі. Пад іх прадуманы адпаведныя сцэнічныя касцюмы?

— Так, калі ўсё атрымаецца, то я буду пераапранацца ажно шэсць разоў. Праўда, не ведаю, калі — самыя вялікія паўзы ў канцэрце будуць па дзве-тры хвіліны, калі прагучыць сольная песня Якава Навуменкі і інструментальная кампазіцыя. Але я пастараюся ўсё паспець, бо вобразы прыдуманы сапраўды цікавыя — ад такой рамантычнай паненкі, якой гледачы бачылі мяне ў фінале конкурсу «Фэст», да сучаснай раскаванай дзяўчыны, якая вельмі любіць джаз.

Адпаведны прыўзняты, святочны настрой дапаможа адчуць публіцы таксама танцавальны калектыў «Озорные огоньки». А яшчэ…. Але, мабыць, хопіць загадзя расказваць — павінны застацца і нейкія сюрпрызы. Прыходзьце і слухайце — гэтае «Люблю» адрасавана вам…

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота з архіва Марыны ВАСІЛЕЎСКАЙ.

Сардэчна віншуем з днём нараджэння юную супрацоўніцу Марыю ЦЯРЭШКА.

Жадаем плёну ў працы, здароўя, светлых мар і кахання.

Аддзел рэкламы газеты «Звязда».

МІХАІЛ ПТАШУК НЕВЫПАДКОВА НАРАДЗІЎСЯ Ў 43-М…

28 студзеня вядомаму беларускаму кінарэжысёру Міхаілу Пташуку споўнілася б 65 гадоў

Міхаіл і Лілія Пташукі.

Ён нарадзіўся ў вёсцы Федзюкі Ляхавіцкага раёна — бадай што ў самы складаны, лёсавызначальны для нашай Радзімы час. Насуперак вайне — жыццё працягвалася.

Яго маці Марыя Сямёнаўна, звычайная беларуская сялянка, — адна з тых мужных жанчын-патрыётак, з якіх пісаў сваю сусветна вядомую «Партызанскую Мадонну» народны мастак Міхаіл Савіцкі.

Беларускія Партызанскія Мадонны нараджалі будучыню. Ды якую!..

Міхаіл Пташук, «дзіця вайны», у сваёй творчасці таксама быў родам з дзяцінства. Значнае месца ў яго кінематографе займала тэма Вялікай Айчыннай вайны. Фільмы «Вазьму твой боль», «Знак бяды», «У жніўні 44-га…» і зараз не пакідаюць абыякавым нікога, вярэдзяць душу. А на творчым рахунку рэжысёра і «Чорны замак Альшанскі», «Наш браняпоезд», іншыя кінастужкі.

Жыццё народнага артыста Беларусі Міхаіла Пташука абарвалася раптоўна, трагічна. Магутнаму беларускаму Птаху — Пташуку — было толькі 59…

Напярэдадні юбілею Майстра з яго ўдавой, рэдактарам кінастудыі «Беларусьфільм» Ліліяй Пташук, мы гутарылі пра жыццё, памяць і любоў.

— Міхаіл Пташук нарадзіўся ў 1943 годзе, калі было вельмі мала немаўлят — ішла вайна…

— Ён невыпадкова нарадзіўся ў 43-м. Гэта промысел Божы, прызначэнне чалавека для асаблівага лёсу. Да такой высновы прыйшла, ведаючы Мішу дзве трэція часткі яго жыцця. Мы ж сустрэліся, калі мне было 15, а яму — 22. Ён, студэнт рэжысёрскага факультэта Шчукінскага вучылішча, прыехаў у Астрахань на практыку (у ТЮГ). Помню, спытала: «А колькі вам гадоў?» Ён адказаў. «Такі стары?!» — здзівілася я. У тым узросце час ацэньваўся крыху інакш…

Так, заўсёды мне задавалася, што я разумела, чаму ён нарадзіўся ў 1943 годзе — ды яшчэ ў блінджы. Таму што яго творчасць у асноўным прысвечана ваеннай тэме. Як ён сам ні спрабаваў адыходзіць ад гэтага, усё роўна не атрымлівалася. Не аднойчы я (мабыць, за нейкага не зусім поўнага разумення) гаварыла: «Ты робіш фільмы пра вайну, а сам хіба ў гэтай вайне ўдзельнічаў? Не. Дык якое ў цябе права займацца такой тэмай: трэба ж самому прайсці праз усё гэта».

А ён жа прайшоў! Яшчэ ва ўлонні маці ён прайшоў вайну. Ужо навукай даказана: у вантробным стане ўсё больш ярка ўспрымаецца і нават запамінаецца.

— Ён сапраўды нарадзіўся ў бліндажы?

— Так. Карціна «Вазьму твой боль» — гэта пра яго. Пра яго маці, цяжарную ў той час. Пра яго бацьку, які быў у партызанах…

Таму ён і ўзяўся экранізаваць раман Івана Шамякіна!..

Свайго бацьку ён амаль не помніў. Мікалай Міхайлавіч памёр вельмі рана, у 33 гады — ва ўзросце Хрыста. Калі мы былі на могілках, на бацькавай магіле, — такім Мішу ніколі не бачыла. Да бацькі былі асаблівыя адносіны — магутнае адчуванне бацькі ў ім жыло. Ён пагладжваў помнік, і вока яго было зусім іншае.

Ён увогуле ніводнай карціны не зняў, не будучы ўдзельнікам падзей. Усё ён помніў са свайго жыцця. Ён невыпадкова гаварыў: «Мне лёгка здымаць». Бо ўсё рабіў паводле вобраза сваёй хаты ў Федзюках. Ён ведаў, дзе ў яго павінна стаяць вядро, дзе венік, дзе павінна быць печ; куды выходзяць вокны… І «Вазьму твой боль», і «Знак бяды», і «У жніўні 44-га» — гэта ўсё быў вобраз яго дома.

Яму лёгка працавалася з акцёрамі, бо ён арганічна адчуваў сябе ў гэтай абстаноўцы, дый акцёры былі… «адаптаваныя» да таго, што адбываецца.

… Хоць, скажу шчыра, я гаварыла Пташуку: «Хопіць, заканчвай пра вайну, мы стаміліся ад вайны». А ён напаўжартам-напаўсур'ёзна: «Я і рад бы з ёй развітацца, але яна мяне не адпускае…». Яна трымала яго, гэтая вайна, настолькі ўчэпіста і глыбока, яна зацягвала і прыцягвала яго… Гэта велізарная гістарычная страсць. А ён быў чалавекам вялікіх тэм і вялікіх страсцей.

Лічу, ён нарадзіўся ў 43-м — менавіта дзеля таго, каб займацца вайной. І ў яго так атрымліваецца, нібыта ён сам прайшоў праз яе. Ён пакутаваў разам са сваім народам, змагаўся… З кожным фільмам ён усё больш і больш браў «на сябе» боль свайго народа. У вялікай творчасці, мабыць, інакш і нельга.

— Міхаіл Мікалаевіч быў адзіным сынам у сям'і?

— Ён быў першынцам. Былі яшчэ малодшыя браты-блізняты, яны памерлі немаўлятамі. Маленькі Міша не разумеў, што такое смерць, таму браў мёртвых брацікаў з труны і гуляў з імі ў садзе, пакуль не адабралі ў яго хлопчыкаў-нябожчыкаў.

Калі Марыя Сямёнаўна, маці, жыла ў нас, ляжачая, расказала: блізнят паспела пахрысціць, але іх не адпелі ў царкве. Праз дзесяцігоддзі гэты абрад быў спраўлены.

Міхаіл быў названы ў гонар свайго дзеда — Міхася Балэбчыка.

— Што значыць — Балэбчыка?

— У іх сям'і мянушка такая была вясковая.

— Як цікава!… А адкуль гэта пайшло?

— Балэб — мясцовая назва булачкі.

— Дык яны ўсе былі круглень-кія?

— Не, яны былі заможныя. Майго Пташука называлі Міша Балэбчыкаў.

— А вас, Лілія Міхайлаўна. мабыць, называлі нявесткай Балэбчыкаў?

— Так! *(Смяецца.)*. Помню, як першы раз мяне ў Федзюкі прывёз… Ён гаварыў: «Мая маці — інжынер-эканаміст, жывём мы ў Баранавічах».

І вось выходзім мы ў Баранавічах з цягніка. Ехалі з Масквы: я там вучылася, Міша працаваў у тэатры «Рампэн»… Кажу: «Давай возьмем таксі і паедзем да тваіх». Ён: «Не, тут яшчэ трэба на электрычцы пад'ехаць». Падышоў дызель — так званая электрычка. Пташук сказаў пра дызель пагарадскому, па-маскоўску. Ён жа не гаварыў мне, што вязе ў такую глухмень. На дызелі праехалі яшчэ два прыпынкі і выйшлі ў… чыстым полі. Навокал збожжа. «Цяпер ужо мы прыехалі! Трэба яшчэ крыху прайсці…». Прайшлі яшчэ праз два вялікія жытнія палі…



Міхаіл Пташук з унукам Мішам на здымках фільма «У жніўні 44-га…».

Заходзім у веснічкі — на дварэ кароў, нядаўна прыйшла з поля, і бабка Ліза пугай яе гоніць дый слоўцамі вострымі падганяе… Баба Ліза села даіць карову, я таксама паспрабавала. Але нічога не атрымалася, карова не дала малака. А калі свякроў захварэла, яе паклалі ў бальніцу, мне давялося самой упраўляцца па гаспадарцы. Скаціне ж нічога не патлумачыш. Мне вельмі ўсё спадабалася, да гэтага ў вёсцы беларускай ніколі не была.

…Пачалі заходзіць вясковыя жанчыны — паглядзець, каго ж прывёз Балэбчык. Гутарылі. І потым маёй свекрыві, Марыі Сямёнаўне, мабыць, добрыя словы казалі. Прынята мяне вёска.

Баба Ліза была вельмі разумнай, мудрай жанчынай. Калі нават яна не ведала чагосьці пра манеры, яна гэта інтуіцыяй, душой разумела. А колькі мне ўсяго цікавага расказала! Напачатку я не вельмі добра разумела мову. Дык Міша кожны вечар даваў мне беларускі тэкст: «Чытай уголас!». Паступова навучыў мове.

Дарэчы, нараджэнне Мішы было звязана з прарочым сном бабы Лізы. Ёй прыснілася, быццам бы ў іх сям'і з'явіўся залаты хлопчык, які з лёгкасцю ўскараскаўся на неба і абышоў яго ад краю да краю. Гэты сон паўтараўся некалькі разоў. Магчыма, гэта і здзейснілася: хлопчык дайшоў ад Федзюкоў да Галівуда.

У Пташука сувязь з вёскай, з родзічамі была надзвычай моцнай. Так атрымалася, што акурат у той дзень, калі здарылася аварыя, ён прыйшоў у прывідзе да сваёй хроснай маці і сказаў: «Валя, мяне машына забіла». А пра трагедыю тады яшчэ ніхто не ведаў. Мы былі ў Маскве, а Валя ў сябе дома, у Галавачах, — гэта вёска непадалёк ад Федзюкоў.

Вельмі хочацца, каб у роднай хаце Міхаіла Пташука быў музей. Але… Закінутая хатка нікому не патрэбная. Вельмі баліць душа за гэта…

— Лілія Міхайлаўна, вы сказалі, што Міхаіл Пташук пэўны час працаваў у тэатры «Рамэн». А ў ім і сапраўды было штосьці такое неўтаймавана-цыганскае…

— У ім сядзеў магутны талент! А талент — паўсюль талент. Пташук праяўляў сябе ў тэатры надзвычай ярка. У «Рамэне» да гэтага часу ідзе пастаўлены ім спектакль «Чатыры жанхі». Пасля «Рамэна» працаваў у Казані. Мы былі маладыя, хацелася свет паглядзець. Яго сябар Фелікс Грыгар'ян запрасіў у Казань. Там далі пакой у 3-пакаёвай кватэры на 5-ым паверсе. Дах пацёк адразу… Нічога не было, толькі тэатральны рэквізіт. Стол, спецыяльна прапаленыя фактураны для нейкага спектакля. Таршэр з абгарэлымі стужкамі, але нам абы святло было… На «казлах» ляжаў матрац, там мы і спалі… У Казані Пташук паставіў цудоўны спектакль «Барон Мюнхгаўзен». Гэта быў сапраўдны фурор! Калі акцёр захварэў, а тэкст ролі Мюнхгаўзена ведаў толькі Пташук, ён сам і выйшаў на сцэну.

— Дык Міхаіл Мікалаевіч па-быў і ў ролі Мюнхгаўзена!.

— Ён быў акцёрам, сыграў некалькі тэатральных і кінароляў. Увогуле, у яго была такая фактура… Ён жа прыгажун, атлет, Геркулес. Помню, прыйшла з ім на акцёрскую біржу ў Маскве — за ім толькі і ганяліся… А «біржа» — гэта: акцёры робяць выгляд, што ім усё абыякава, яны прыйшлі пагутарыць адзін з адным. А рэжысёры ходзяць-прыглядаюцца… Яго столькі разоў зазывалі ехаць у розныя тэатры — як акцёра.

… Калі ён сыграў Мюнхгаўзена — спектакль прайшоў за паўтары гадзіны замест трох, таму што Пташук сваім буйным крокам імклівa рухаўся па сцэне. Прыйшла ў той вечар дадому, у наш пакой, бачу: ён пластом ляжыць на нашых «казлах». Спужалася.

— Што з табою? — пытаюся.

— Мюнхаўзэна адыграў, — адказаў ён асіплым пасля ролі голасам.

— У вас дачка…

— Дачка Ліка — гэта выліты бацька. Да яе перайшлі ўсе яго таленты. Нават фізічныя манеры: як яна гаворыць, як знешне праяўляецца — гэта ўсё бацька… Яна скончыла Шчэпкінскае тэатральнае вучылішча ў Маскве. Працавала ў двух вядомых маскоўскіх тэатрах, здымалася ў кіно, выйшла замуж, нарадзіла сына. Нашаму Мішачку 12 з палавай гадоў. Гэта наша самая вялікая радасць. Мішка быў разам з дзедам на здымках «Жніўня…» — і быў там праменьчыкам святла для ўсёй здымачнай групы.

— Міхаіл Пташук так многа паспеў зрабіць…

— Іван Шамякін сказаў пра яго: «Калі адыходзіць адзін член грамадства — гэта вялікая страта. Але калі адыходзіць талент — гэта нацыянальная трагедыя».

Міхаіл Пташук — па-сапраўднаму беларускі рэжысёр, у творчасці яго прысутнічае беларускі дух… Дух, які быў увабраны ім з малаком маці. Работы Пташука ні з чым не пераблытаеш: пачынаецца фільм — і адразу разумееш, што ён пра Беларусь, якую Міша любіў верна і аддана…

Таццяна ПАДАЛЯК.
Фота з сямейнага архіва Л.М. Пташук.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.07	16.37	8.30
Віцебск —	8.02	16.21	8.19
Магілёў —	7.57	16.27	8.30
Гомель —	7.48	16.30	8.42
Гродна —	8.21	16.54	8.33
Брэст —	8.15	17.01	8.46

Месяц

Поўня.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Елізара, Пятра, Якава;*
К. *Ванды, Паўліны, Палікарпа, Цімафея, Ціта.*

НАДВОР'Е на заўтра



— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

Геамагнітныя ўзрушэнні

2 гадз.	5 гадз.	8 гадз.	11 гадз.	14 гадз.	17 гадз.	20 гадз.	23 гадз.

…у суседзяў

ВАРШАВА +1..+3°С	КІЕЎ -1..+1°С	РЫГА 0..+2°С
ВІЛЬНЮС -1..+1°С	МАСКВА -1..+1°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ -3..-1°С

Дзве даты

26 студзеня

1558 год — 450 гадоў таму пачалася Лівонская вайна — вайна Маскоўскай дзяржавы з Лівонскім ордэнам, Вялікім княствам Літоўскім, Рэччу Паспалітай і Швецыяй за тэрыторыю Лівоніі (тэрыторыя цяперашніх Літвы і Латвіі) за выхад да Балтыйскага мора. Пачалася па ініцыятыве цара Івана IV Грознага. Завяршылася ў 1583 годзе паражэннем Масковіі.

1784 год — Бенджамін Франклін, адзін з бацькоў-заснавальнікаў Злучаных Штатаў, выказаў шкадаванне з нагоды таго, што арол стаў афіцыйным сімвалам ЗША, заявіўшы, што ён аддаў бы перавагу індычцы.

Цытата дня:

«Магчымасць таго, што мы можам пацярпець паражэнне ў баі, не павінна перашкаджаць нам змагацца за справу, якую мы лічым справядлівай».
Аўраам Лінкальн (1809—1865), 16-ы прэзідэнт ЗША.

Інфарм-укол

КАЛІ ПІВА, ДЫК НЕ ФІЛЬТРАВАНАЕ

Карысць піва — гэта, галоўным чынам, вітаміны групы В. Сярод іншых актыўных рэчываў — незаменныя амінакіслоты, поліфенолы, рэчывы клетачных абалонак дражджэй, якія іграюць ролю імунастымулятараў.

Невыпадкова піва здаўна прызначалі пры розных захворваннях. Яно дапамагае пры фурункулёзе, спрыяе страваванню, валодае мачагонным дзеяннем, лечыць бяссонніцу. Але ўся гэта карысць ёсць толькі ў нефільтраваным напоі.

Згодна з нямецкім «Законам чысціні 1516 года» сапраўднае піва можна гатаваць толькі з чатырох кампанентаў — вады, соладу, хмелю і дражджэй. Піўныя дрожджы бываюць двух відаў — верхавыя і нізавыя. З першых, як правіла, і атрымліваюць не фільтраванае піва. Другі від можа збрадзіць цукры толькі пры паніжанай тэмпературы, пасля чаго яны асядаюць на дно (адсюль і назва). У якасці соладу для такога піва часцей за ўсё выкарыстоўваюць ячмень. Да піва нізавога браджэння (так званых лагераў) мы якраз і прывыклі. Абсалютную большасць лагераў звычайна фільтруюць.

ЦІ РАСКАЗВАЦЬ ПРА СЯБЕ ЎСЁ?

Некаторыя мяркуюць, што каханаму(ай) варта ведаць пра наша жыццё ўсё — амаль да падрабязнасцяў.

Французскі сямейны псіхатэрапеўт Робер Нябуржэр засцерагае ад залішняй шчырасці: «Не варта расказваць партнёру аб сваім сэксуальным вопыце, калі толькі гаворка не ідзе аб нейкіх сур'ёзных эпізодах, здольных паўплываць на вашы з ім сэксуальныя адносіны, напрыклад, аб жорсткасці вашага былога партнёра або аб згвалтаванні. Калі такіх праблем не было, да гэтай тэмы лепей падыходзіць з асцярожнасцю і ўзважваць свае словы: сэксуальныя адносіны — рэч далікатная». Каб не разбурыць давер у пары, не варта рабіць прадметам размовы і выпадковыя любоўныя паходжанні. А вось аб важных для вас адносінах, якія засталіся ў мінулым, лепей расказаць: гэта дазваляе не паўтараць старых памылак і зразумець, што мае сур'ёзнае значэнне для вас і любімага чалавека.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Усміхнёмся!

Мужчына — гэта чалавек, які падзяляе кветкі на два віды: ружы і «а вось гэтая як завецца?».

☺

Двое знаёмых размаўляюць:
— Слухай, ты колькі зарабляеш?
— 300 тысяч рублёў…
— Во дурань!
— У гадзіну…
— Во гад!

☺

Калі муж раўнуе, значыць, любіць, а калі не раўнуе, значыць, пакуль яшчэ нічога не ведае.

☺

Дзве сяброўкі.
— Іду я ўчора ноччу па цёмнай вуліцы, раптам бачу — спераду мужчынскі сілуэт! Ну, я і бягом!
— Дагнала?..

☺

На гэтых трох дыскетах сабраныя лепшыя галы зборнай Беларусі за 10 гадоў у DVD якасці.

☺

— Я нядаўна кракадзіла завёў.
— А суседзі не сварацца?
— Каму ж там сварыцца…

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

Грэчка — не проста каша

Грэцкая каша — любімая наша ежа. Існуе нямала арыгінальных рэцэптаў яе прыгатавання. Аднак сёння мы будзем гаварыць аб тым, як пры дапамозе грэчкі паздаравець, і ўявім сабе, што яна — неабходнае лякарства.

Пры **анеміі** сухія грэцкія крупы нагрэйце на патэльні, затым размяліце іх у кавамолцы. Прымайце па 2 ст. лыжкі грэцкай мукі, запіваючы малаком, 3 разы на дзень. Для ўзмацнення эфекту спалучайце прыём круп з прыёмам грэчкавага мёду (па 1 ст. лыжцы).

Тым, хто пакутуе ад **дыфузнага таксічнага валляку**, рэкамендуецца ўзяць крыху грэцкай мукі, дадаць роўную колькасць здробненых грэцкіх арэхаў і натуральнага мёду, перамяшаць, прымаць па 1 ст. лыжцы 3 разы на дзень.

Каб запаволіць **алкагольнае ап'яненне** ў час застолля, за 40 хвілін да яго з'ешце некалькі лыжак грэцкай кашы.

Некалькі порцый грэцкай кашы на дзень не толькі накормяць, але і акажуць добры ўплыў на **тонус кішэчніка** — дапамогуць пры запоры. Але для гэтага трэба гатаваць кашу-»размазню», г.зн. яна не павінна быць крутой.

Грэцкая мука добра загойвае **апёкі скуры**. Падсмажце муку да жоўтага колеру, замясіце на вадзе цеста і выкарыстоўвайце для змазвання апёкаў.

Пры **рожыстым запаленні, фурункулёзе**, **нарывах** падсмажце грэцкія крупы да жоўтага колеру, астудзіце, змяліце ў парашок і злучыце з такой жа колькасцю воцату, каб атрымалася клейкая кашка. Накладвайце яе ў выглядзе аплікацый на балючыя месцы, мяняйце павязкі 2 разы на суткі.

Дыябетыкам карысна на снеданне і за паўгадзіны да вячэры прымаць шклянку кефіру, у якой размешана 1 ст. лыжка грэцкай мукі. Можна прыгатаваць і такую сумесь: грэцкую муку (5 частак) змяшайце са здробненымі грэцкімі арэхамі (1 частка), 1,5 ст. лыжкі сумесі заліце 0,5 шк. кефіру ці кіслага малака, не размешвайце. Зранку з'ешце нашча разам з яблыкам.

Пры хваробах **шчытападобнай залозы** вазьміце па шклянцы грэцкіх круп, грэцкіх арэхаў, грэчкавага мёду. Здрабніце крупы і арэхі, змяшайце з мёдам. Адзін дзень на тыдзень ешце пакрыху толькі гэту сумесь, запіваючы чаем ці вадой.

Калі вам трэба **ачысціць арганізм** і пры гэтым пазбавіцца ад лішняй вагі, паспрабуйце тры дні есці толькі грэчку, звараную на вадзе без солі. Такая манадыета ўмацуе ваша здароўе, нармалізуе вагу і не створыць нязручнасцяў.

МУЖЧЫНА Ў ДОМЕ

Можна замяніць, а можна і адрамантаваць

Тонкая гумавая сценка паўсферычнай грушы зліўнога механізма бачка ўнітаза праз некаторы час губляе эластычнасць і пачынае прагінацца ўнутр. Утвараецца шчыліна, скрозь якую ва ўніташ пастаянна выцякае вада. Вядома, лепш замяніць грушу на новую, аднак і старая яшчэ пэўны час можа паслужыць, калі напхаць яе пакуллем, мешкавінай ці вяроўкай з сінтэтычнага валакна, каб надаць сценкам правільную сферычную форму. А калі сценка грушы не дэфармаваная, але вада ўсё роўна цячэ, то трэба ўцяжарыць грушу, паклаўшы ўнутр дзве—тры цяжкія гайкі і нанізаўшы на іх цягу, каб не выпалі.

-2473-

ГАСПАДЫНІ НА ЗАМЕТКУ

Выбіраем плед

Прыемна халодным сырым вечарам захутацца ў цёплы, утульны плед. Ён дае адчуванне камфорту, спакою, поўнага адпачынку. І не толькі: гэта яшчэ і прыкметны штрых у інтэр'еры сучаснага дому.

Выбар пледа — гэта пытанне вашых звычак і прыхільнасцяў. Любіце доўгі і пушысты ворс ці вас раздражняе, што варсінкі трапляюць на твар? Якая фактура больш прыемная вашай скуры: гладкая ці рэльефная? Аддаяце перавагу лёгкім абдымкам бавоўны ці прыемнаму цяжару шэрсці? Каб палегчыць выбар, заўважым, што пералічаныя ўласцівасці моцна не адбіваюцца на ступені цяпла, якое дае плед: усе сучасныя матэрыялы даволі цеплаёмістыя .

Звярніце ўвагу на дызайн і малюнак. Калі вам спадабаўся аднатонны, гладкі плед — выбар нескладаны. Іншая справа — фактурны выраб, з малюнкам, выкананым да таго ж кантрастнымі фарбамі. У гэтым выпадку прыгледзьцеся, ці добра зроблены малюнак, ці завершаны яго сюжэт. Раім раскласці плед на прылаўку і старанна праверыць, як паўтараюцца дэталі арнаменту, завершанасць сюжэтных ліній, бо плед — гэта не кавалак тканіны, ён павінен мець чатырохбаковую закончанасць.

Неабходна ўважліва агледзець месцы згінання. Калі яны пазначаны занадта выразна, калі ворс у гэтых месцах скамячыўся ці крыху пацёрся, гэта значыць, што плед будзе недаўгавечным і хутка зносіцца.

Заўважылі занадта доўгую пятлю, клубок збытых варсінак, няроўнае, несіметрычные вязанне — магчыма, гэта не брак, але паказчык нізкай якасці вырабу. Калі, лежачы на прылаўку, ён ужо «зарабіў» прыкметы зносу, то ўявіце сабе, як хутка плед згубіць форму.

Пры набыцці моднага на сёння пледа з тонкай шэрсці — пашміны — асцерагайцеся падробкі. Пледы нізкай якасці часта начэсваюць для надання мяккасці. Занадта бліскучая тканіна сведчыць аб вялікай колькасці шоўку. Класічнае спалучэнне: 30 працэнтаў шоўку і 70 працэнтаў шэрсці — не дапускае дэфармацыі фактуры. Прыгожы выраб з сапраўднай пашміны можа перадавацца з пакалення ў пакаленне.

Паглядзіце на краявое аздабленне пледа. Край можа быць дэкаратыўна абшыты стужкай, тасьмой, апрацаваны тоўстай ніткай «праз край» ці ўпрыгожаны касічкамі. Тут справа густу. Галоўнае, каб дэкор краю вас потым не раздражняў, а спалучаўся са стылем інтэр'еру і быў якасна выкананы. Касічкі павінны быць туга скручанымі і аднаго памеру, тасьма — аднолькавай шырыні з усіх бакоў, дэкаратыўная нітка — добра замацаваная на канцах.

ЗАХОЎВАЕМ І ДАГЛЯДАЕМ

- Большасць пледаў патрабуюць хімчысткі, таму ўважліва вывучыце склад і сродкі, якія рэкамендуюцца для чысткі пледа (яны пазначаны ў анатацыі).
- Тонкія шарсцяныя пледы вытворцы рэкамендуюць мыць у халоднай вадзе, выкарыстоўваючы спецыяльныя мяккія мыйныя сродкі.
- Пасля мыцця плед не выкручвайце, а па магчымасці раскладзіце на гладкай паверхні. Прасаваць шарсцяныя і шаўковыя пледы трэба толькі праз марлю.
- Сачыце за тым, каб ворс пледа не збіваўся. Шарыкі, якія ўтварыліся, акуратна выдаляйце спецыяльнай машынкай ці брытвай.

-2474-

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, нос